Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛІСТАПАДА 2014 г. ПЯТНІЦА № 221 (27831) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**



Такі прыгожы сюрпрыз

СТАР. 3



Майстар-клас па даенні кароў

СТАР. 4

# Звонкая работа

*У Заслаўі, на прадпрыемстве «Енісей», шкла — на любы густ. Яно і не дзіва: тут яго рэжуць, шліфуюць, пакрываюць узорамі. Празрыстая прыгажосць розных формаў — паўсюдна, ад уласных шматлікіх адлюстраванняў на звонкай паверхні і зніякавець можна. А Марыі ШАРАНОК, начальніку аддзела тэхнічнага кантролю, гэта зусім не перашкаджае дасканала правяраць якасць апрацаванай прадукцыі.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый ЦАПКАЛА, дырэктар ДУ «Адміністрацыя Парку высокіх тэхналогій»**

***«Трэба развіваць тое, што ў нас добра атрымліваецца. Сёння Беларусь ужо з'яўляецца адным з агульнапрызнаных лідараў у Еўропе ў галіне IT. Калі мы будзем на гэтым канцэнтравацца і далей, станем аднымі з сусветных лідараў у гэтай галіне. Ужо становімся. Пра гэта, напрыклад, сведчаць поспехі нашых распрацоўшчыкаў у галіне камп'ютарных гульняў, мабільных дадаткаў. Цяпер гэта трэнд. Мы пачалі займацца распрацоўкай мабільных дадаткаў, калі пра гэта ніхто яшчэ і не думаў. Для невялікай краіны гэта каласальны поспех. Сёння Парк высокіх тэхналогій — гэта ўжо вопытная індустрыя інфармацыйных тэхналогій, прыкметная ў свеце. І мы працягваем ствараць уласную «экасістэму», дзе павінны ўзнікаць усё новыя і новыя кампаніі, якія неўзабаве будуць вызначаць твар эканомікі краіны».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.11.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10780,00 | ▲ |
| Еўра | 13510,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 230,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 709,21 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

# СНЕГ І МОКРЫ СНЕГ...



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## А ў панядзелак уначы чакаецца да мінус 12 градусаў

**У пятніцу, пераважна на захадзе краіны, будуць ісці ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Менавіта там будзе галалёд і сур'ёзная галалёдзіца на дарогах, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У выхадныя надвор'ем у нас пачне кіраваць малаактыўны атмасферны фронт, які прынясе ў Беларусь амаль зіму. У суботу ў заходніх і цэнтральных раёнах, а ў нядзелю месцамі па краіне прагназуецца кароткачасовы снег і мокры снег. Месцамі туман, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ў ноч на выхадныя складзе 1-7 марозу, на ўсходзе — да мінус 9 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў ускраіны халоднага антыцыклону з цэнтрам над сярэдняй Волгай. Таму ў панядзелак чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўначы па паўднёвым захадзе Беларусі магчымы невялікі снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы пахаладае да 3-10 марозу, пры праясненнях — да мінус 12 градусаў. Удзень будзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Істотна не зменіцца характар надвор'я і ў аўторак: зноў месцамі мокры снег і слабы галалёд.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ На слыху

# ЛЯЧЭННЕ — СПРАВА ТОНКАЯ. А ЧАСАМ І НЕБЯСПЕЧНАЯ

## У Магілёве кожны месяц да 5 дзяцей атручваюцца лекамі

**Раней, калі ў мяне пачыналіся прастуда ці грып, на свой страх і рызыку піла розныя растваральныя парашкі, пакуль аднойчы не прачытала, што яны змяшчаюць не вельмі небяспечныя для печані і нырак дозы парацэтамолу... Але ці часта мы ўнікаем у тыя супрацьпаказанні, якія пазначаны не самымі вялікімі літарамі? Галоўнае — «задушыць» прастуду на корані. І не толькі прастуду. Памятаю, як аднойчы літаральна з рабочага кабінета «хуткая» забрала супрацоўніка з ацёкам Квінке — так яго арганізм адрэагаваў на таблетку тэмпалгіну, прынятую ад галаўнога болю. Аб чым, дарэчы, папярэджвалася ў супрацьпаказаннях. Апошнія змяненні ў правілах водпуску лекаў, якія прадугледжаны 66-й пастановай Міністэрства аховы здароўя, якраз і накіраваны на тое, каб людзі не эксперыментавалі на сабе і не займаліся самалячэннем. Вядома, што нашкодзіць сабе можна нават зёлкамі, калі ўжываць іх, не ведаючы пра некаторыя ўласцівасці. Што ўжо казаць пра таблеткі!**

Вось і на гэты раз пры першых сімптомах каварнай «інфлюэнцы» адразу ж пачала прымаць меры. Дастала з хатняй аптэчкі рэмантадзін, а праз дзень, калі ён не дапамог, перайшла на «АнГрыМакс». Пры гэтым рабіла інгаляцыі і актыўна паласкала горла растворам з содай. Пакуль не зразумела, што ісці ў паліклініку ўсё роўна давядзецца. За соду мне якраз і дасталося ад урача. Аказалася, яна горла падсушвае, і лячыць запаленне содай — гэта ўсё роўна, што сыпаць соль на рану.

СТАР. 2

# НА РЭЙКАХ ІНВЕСТЫЦЫЙ

## Прэферэнцыі ў нашай краіне будуць толькі для прадпрыемстваў сусветнага ўзроўню, якія ствараюць высокатэхналагічную і канкурэнтаздольную прадукцыю

**Учора ў Дзяржынскім раёне адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця завода «Штадлер Мінск». Прадпрыемства па новай, унікальнай для нашай краіны, вытворчасці сучасных электрацягнікоў з'явілася ў Фаніпалі за рэкордна хуткі час. Усяго два гады таму, у кастрычніку 2012 года, на гэтым месцы была закладзена сімвалічная капсула ў фундамент будучага завода, а цяпер прадпрыемства ўжо дзейнічае.**

Такая паспяховая работа буйнога інвестара — швейцарскай кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» — не выпадковасць. Гэта сведчанне таго, што ў нашай краіне створаны спрыяльны інвестыцыйны клімат. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прадпрыемства, паведамляе БЕЛТА.

«Высокай ацэнкі заслугоўвае такі вынік зладжанай работы будаўнікоў, інжынераў, спецыялістаў і кіраўніцтва кампаніі «Штадлер». Ад ідэі і да яе ажыццяўлення — аптымальны тэрмін», — падкрэсліў Прэзідэнт. На яго думку, гэта добры прыклад для пераймання і для іншых інвестыцыйных праектаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў таксама важнасць таго, што запланаваныя да вытворчасці на прадпрыемстве «Штадлер Мінск» электрацягнікі заваявалі добрую рэпутацыю ў Беларусі і выйшлі на рынак пасажырскіх перавозак Масквы. Інтарэс да прадукцыі новага прадпрыемства выказваюць і іншыя краіны — удзельніцы Еўразійскага эканамічнага саюза і СНД.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што паспяховая работа «Штадлер Рэйл Груп» у Беларусі паслужыць прыкладам для прыходу сюды іншых кампаній. «У нас ёсць шмат перспектыўных інвестыцыйных праектаў, якія мы зацікаўлены рэалізаваць з удзелам замежнага капіталу, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму заўсёды гатовы да абмеркавання любых ініцыятыў і прапаноў, што дадуць магчымасць умацаваць эканоміку нашай дзяржавы, стварыць у краіне сучасныя высокатэхналагічныя вытворчасці, інфраструктуру і новыя высокааплатныя рабочыя месцы».

Прэзідэнт нагадаў пра сваё абяцанне кіраўніку швейцарскай кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Петэру Шпулеру аб тым, што ў Беларусі будзе надавацца належная ўвага развіццю гэтай кампаніі. «Як бачыце, сваё слова кіраўніцтва краіны і Прэзідэнт стрымалі. Цяпер чакаю, што кіраўніцтва швейцарскай кампаніі і створанага ў Беларусі завода стрымае сваё слова і выканае абяцанае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Было абяцана, удакладніў кіраўнік дзяржавы, што з будаўніцтвам завода па выпуску сучасных электрацягнікоў старая пляцоўка «Белкамунмаша» будзе развівацца сямімільнымі крокамі, не застанецца на задворках новага прадпрыемства, а будзе такім жа высокатэхналагічным, як «Штадлер Мінск».

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем адзначыў, што атрымлівае крыху іншую інфармацыю. Прэзідэнт запатрабаваў, каб да новага года былі прыняты ўсе неабходныя меры з боку як беларускага ўрада, так і «Штадлер Мінск», Мінаблвыканкама і Мінгарвыканкама, каб на «Белкамунмашы» было створана сучаснае высокатэхналагічнае прадпрыемства. Прэзідэнт даручыў КДК узяць гэтае даручэнне на кантроль, а Адміністрацыі Прэзідэнта надаць належную ўвагу гэтаму пытанню.

Як запэўнілі Аляксандра Лукашэнку кіраўнікі швейцарскай кампаніі, яны маюць намер распрацаваць канцэпцыю перспектыў развіцця «Белкамунмаша».

Адказваючы на пытанні журналістаў падчас наведвання завода «Штадлер Мінск», Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі будуць прэферэнцыі толькі прадпрыемствам сусветнага ўзроўню, якія ствараюць высокатэхналагічную і канкурэнтаздольную прадукцыю. «Мы цяпер не плануем і не будуем вытворчасці другараднага ўзроўню, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Навошта нам ствараць прадпрыемствы, якія выпускаюць не запатрабаваную на рынках прадукцыю? А рынкі сёння вельмі моцныя і на іх вялікая канкурэнцыя». «Швейцарская кампанія прыйшла да нас з грашыма, новымі тэхналогіямі, са сваім рынкам. Яны ведаюць, куды прадаць сваю прадукцыю», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у час сустрэчы з кіраўніком кампаніі і старшынёй Савета дырэктараў «Штадлер Рэйл Груп» Петэрам Шпулерам ён прапанаваў і іншым кампаніям прыйсці ў Беларусь. «Ён прабіў вялікую дарогу, па якой могуць пайсці ў Беларусь іншыя бізнесмены Еўропы», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Закранаючы пытанне санкцый Захаду, Прэзідэнт заявіў, што яны ніяк не паўплываюць на развіццё супрацоўніцтва Еўрасаюз — Беларусь — Еўразійскі эканамічны саюз. «І калі ў эканоміцы мы пачалі ўжо гэтыя крокі, ідзём у гэтым напрамку, Петэр Шпулер сказаў, што ён не падтрымлівае гэтыя санкцыі, таму што яны на шкоду і еўрапейцам, і расіянам. Калі ў эканоміцы мы ўжо штосьці зрабілі, то цяпер, вы заўважылі, ужо і ў палітыцы пачалі пагаворваць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Паводле яго слоў, абмяркоўваючы ўкраінскае пытанне, палітыкі гавораць аб дыялогу паміж ЕС і ЕАЭС. «У прыватнасці, міністры замежных спраў Германіі, Расіі і Беларусі ўжо аб гэтым гавораць. Гэта нармальны фармат. Але гаварыць з падачы немцаў. Значыць, ужо і ў палітыцы ЕС ёсць зрухі», — дадаў беларускі лідар.

Што датычыцца санкцый, то Аляксандр Лукашэнка лічыць іх анахранізмам. «Вы ведаеце, што не Еўропа была ініцыятарам. Еўропа вельмі шмат ад гэтага страчвае. Але, відаць, пакуль вельмі залежыць Еўропа ад іншых цэнтраў сіл», — адзначыў Прэзідэнт. На яго думку, як бы ні было складана, усё роўна сітуацыя ва Украіне ідзе да міру і гэты санкцыйны працэс рана ці позна завершыцца.

«Бізнес задушыць немагчыма. Сёння аднаго чалавека цяжка ізаляваць, а такія гіганцкія рэгіёны, як Еўразійскі саюз, ЕС, — ніколі не ізалюеш», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён дадаў, што вельмі цесныя ўзаемасувязі, нават на ўзроўні адносін паміж людзьмі.

«Прыйдзе час, і мы забудзем аб гэтых санкцыях. Але перш чым пра іх забудзем, мы іх пераадолеем. Пераадолеюць такія бізнесмены, як Шпулер. Ніхто іх не прымусіць кінуць тут уласныя сродкі, якія яны ўклалі», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя эканамічнага складніка, адкрыццё новых сучасных прадпрыемстваў, у тым ліку і з замежным капіталам, не менш важны і сацыяльны. Фаніпаль і Дзяржынск стануць гарадамі-спадарожнікамі Мінска і індустрыяльнымі цэнтрамі краіны, заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Мы першапачаткова не планавалі, што гэта будуць гарады-спадарожнікі. Але сітуацыя склалася так, што тут створаны новыя вытворчасці (і не толькі «Штадлер Мінск») і яны ператварыліся ў індустрыяльныя цэнтры краіны», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Журналісты пацікавіліся, ці плануецца дадатковае будаўніцтва жылля ў сувязі з адкрыццём новых прадпрыемстваў. Прэзідэнт адказаў: «Хочаш не хочаш, а жыллё трэба будзе будаваць, і дзяржава ў гэтым адыграе сваю ролю. Але астатняе — за самімі людзьмі і прадпрыемствам. Мы разлічваем і пакуль бачым гэта — зарплаты тут добрыя, і ўпэўнены, што яны будуць расці. Таму што гэта суперсучасная вытворчасць».

Аляксандр Лукашэнка, спаслаўшыся на ацэнку кіраўнікоў швейцарскай кампаніі, адзначыў высокі ўзровень кваліфікацыі беларускіх спецыялістаў. Яны хутка і на вельмі высокім узроўні асвоілі работу на новым прадпрыемстве. Адным са стымулаў для замацавання спецыялістаў можа стаць менавіта жыллё. «Я думаю, што кіраўнікі прадпрыемства таксама павінны перажываць за тое, каб утрымаць высокакваліфікаваных спецыялістаў. Адным са спосабаў вырашэння жыллёвага пытання з'яўляецца арэнднае жыллё. Заключыў дагавор — далі кватэру. Пакуль чалавек працуе — ён у ёй жыве. Калі звольніўся — арэнднае жыллё трэба вызваліць. Што выгадна для кіраўніка любога прадпрыемства, і, дарэчы, гэта вопыт, які добра зарэкамендаваў сябе ў многіх еўрапейскіх краінах», — сказаў Прэзідэнт.

# ЛЯЧЭННЕ — СПРАВА ТОНКАЯ. А ЧАСАМ І НЕБЯСПЕЧНАЯ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На мае спачуванні наконт новаўвядзенняў па водпуску лекаў (цяпер усе рэцэпты, прад'яўленыя пакупніком, застаюцца ў аптэцы) і дадатковай працы для ўрачоў, тэрапеўт толькі цяжка ўздыхнула. А пры нагадванні пра электронныя рэцэпты нават абурылася: «І дзе ж вы тут у мяне бачыце камп'ютар? У нас у горадзе нават электронныя талончыкі толькі ў Цэнтральнай паліклініцы існуюць».

Калі купляла ў аптэцы выпісаныя мне лекі, адзначыла, што рэцэпт на таблеткі ад кашлю «Лібексін» у мяне не забралі. Адказалі, што гэта не «той прэпарат, які ўяўляе для іх інтарэс». Вось калі б там значыліся «Ібуклін» ці «Ібузам» — іншая справа. Гэтыя прэпараты валодаюць высокай таксічнасцю і таму трапілі ў спіс «абмежаваных».

**Бескантрольная закупка лекаў ільготнікамі — а гэта часцей за ўсё нашы дзядулі і бабулі — прыводзіць да таго, што ў кватэрах утвараюцца аптэчныя міні-склады. Людзі робяць запас на «чорны дзень» і ў большасці выпадкаў не паспяваюць выкарыстоўваць гэтыя лекі да заканчэння тэрміну прыдатнасці.**

**Галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Ігар КАСКО** упэўнены, што змяненні пойдуць толькі на карысць спажыўцам.

— Трэба памятаць, што цалкам бяспечных медыцынскіх сродкаў наогул у прыродзе не існуе, — кажа ён. — Гэта ўсё хімічныя прэпараты, у кожнага з якіх шмат супрацьпаказанняў. Бескантрольная закупка лекаў ільготнікамі — а гэта часцей за ўсё нашы дзядулі і бабулі — прыводзіць да таго, што ў кватэрах утвараюцца аптэчныя міні-склады. Людзі робяць запас на «чорны дзень» і ў большасці выпадкаў не паспяваюць выкарыстоўваць гэтыя лекі да заканчэння тэрміну прыдатнасці. Гэта перавод грошай і, што яшчэ больш небяспечна, пагроза для здароўя тых жа ўнукаў.

Дарэчы, па словах **загадчыка рэанімацыйнага аддзялення гэтай установы Андрэя ПАНОВА**, на працягу месяца ў аддзяленне трапляе ў сярэднім па 4-5 дзяцей, якія «пакаштавалі» бабуліны таблеткі. Іх прывозяць у крайне цяжкім стане — з нізкім ціскам, з порушэннем... 

— Нават парацэтамол пры перадазіроўцы можа прывесці да вострай пячоначнай недастатковасці, калі адзінае выйсце — гэта перасадка печані, — падкрэслівае **намеснік галоўнага ўрача абласной дзіцячай бальніцы Алена ШУЛЕЙКА.** — Атруціцца можна нават «Нафтызінам», калі злоўжываць гэтымі кроплямі.

Алена Шулейка прыводзіць прыклады, калі ў бальніцу трапляюць дзеці, якія з-за недагляду дарослых праглынаюць нават падобныя на таблеткі батарэйкі і атрымліваюць пры гэтым унутраныя апёкі. Іншыя спрабуюць на смак таксама падобны па знешнім выглядзе на лекі пральны парашок у капсулах. І — зусім свежы прыклад. У тры гадзіны ночы ў бальніцу прывезлі малога, які з'еў таблетку «ад молі». Бабуля не знайшла нічога іншага, як даць дзіцяці пагуляць з бліскучай паперкай. Ведама, што на такіх безадказных бабуль наўрад ці падзейнічаюць змяненні правілаў водпуску медпрэпаратаў. Але ж хапае і такіх выпадкаў, калі дзеці самастойна ласуюцца «салодзенькім» клафелінам...

— Зразумела, што тэхнічнай працы медыкам прыбавілася, і гэта не ўсім даспадобы, — разважае Ігар Каско. — Але ці добра, калі хвораму выпісвалі таблеткі на год, а ён карыстаўся рэцэптам 2 гады? Маўляў, я сам разбяруся — навошта мне ўрач? А між тым, гэта неапраўданая рызыка. Людзі хвалююцца, што ад змяненняў пацерпяць хранічныя хворыя. Але ж без лекаў яны ні ў якім разе не застануцца. Закон прадугледжвае такія сітуацыі — пацыенту выпісваецца адразу некалькі рэцэптаў на паўгода. Потым зноў трэба паказацца ўрачу. І гэта менавіта ў інтарэсах хворага, калі ён не хоча ўскладненняў.

Антыбіётыкі — наогул дрэннае «выйсце», калі хворы сам сабе іх прызначае. Вядома ж, гэта ўдар па імуннай сістэме. Амаль на ўсе гэтыя прэпараты, акрамя хіба што амоксіцыліну і ампіцыліну, зараз патрэбны рэцэпты. Хочаш не хочаш, а прыйдзецца ісці да ўрача.

Той факт, што няправільнае ўжыванне таблетак можа нанесці вельмі значную шкоду арганізму, пацвярджае і **галоўурач Магілёўскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансера Віктар ВАРАБ'ЁЎ.**

— У апошні час узнікае даволі сур'ёзная праблема — устойлівасць да антыбіётыкаў, — кажа ён. — І прычына гэтага менавіта ў самалячэнні. Калі чалавек самастойна ўжывае, напрыклад, такі моцны антыбіётык, як рыфампіцын, у яго можа развіцца форма туберкулёзу, трывалая ў дачыненні да гэтага сродку. А выпадкаў, калі чалавек прастудзіўся, пачаў лячыцца самастойна, а потым трапіў да нас з запаленнем лёгкіх, колькі заўгодна. Я лічу, што не на карысць медыцынскай справе і рэклама лекавых прэпаратаў у СМІ. Той жа гропрынасін, які прапануецца як сродак ад прастуды, небяспечна прымаць, не ведаючы свой імунны статус. Але купіць яго можна без рэцэпту...

Лекавых сродкаў, якія адпускаюцца для лячэння рэспіраторных, інфекцыйных захворванняў і грыпу без рэцэпта ўрача, сапраўды хапае. Сярод іх — супрацьвірусныя арпетол ці арбідол, рэмантадзін, інтэрферон, аксалінавая мазь, той жа «АнГрыМакс». Няма абмежаванняў па набыцці такіх гарачкапаніжальных і супрацьзапаленчых сродкаў, як ібупрафен, парацэтамол ці німесулід. Не ўзнікне праблем з набыццём сродкаў для падтрымкі імунітэту — накшталт эхінгіну ці цыклаферону.

— Без рэцэптаў урача сёння адпускаецца каля 60% ад усіх лекаў, — удакладняе **намеснік генеральнага дарэктара магілёўскага прадпрыемства «Фармацыя» Алена РАМАНЕНКА.** — Пад кантроль узяты менавіта тыя прэпараты, якія ў мэтах бяспекі прымаюцца пад наглядам урача. А таксама тыя, якія пры некантраляваным прыёме могуць выклікаць пабочныя эфекты. І гэта, лічу, зроблена правільна.

— Гэта ўсё сінтэтычныя рэчывы, якія вельмі моцна ўздзейнічаюць на адчувальную мікрафлору чалавека, — дадае Ігар Каско. — Бескантрольнае іх ужыванне можа кардынальна змяніць яе і зрабіць некаторыя мікраарганізмы ўстойлівымі да прэпарата. Калі ўлічыць тое, што чалавек — істота сацыяльная, якая пастаянна «абменьваецца» мікраарганізмамі з іншымі людзьмі, вынікі могуць быць зусім несуцяшальнымі не толькі для кагосьці асабіста. І патрэбнага эфекту ад лекавага сродку не будзе.

Дарэчы, пра тое, якія лекі зараз прадаюцца па рэцэптах, а якія — без, жыхары Магілёва і Бабруйска могуць даведацца па тэлефонным нумары 169.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ Ў ГРОДНЕ БУДЗЕ БОЛЬШ

**Згодна з інфармацыяй упраўлення капітальнага будаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама, да канца года ў мікрараёне Паўднёвы-2 будуць уведзены ў эксплуатацыю дзве арэндныя шматпавярхоўкі на 71 і 76 кватэр.**

Кошт арэнды аднаго квадратнага метра добраўпарадкаванага жылля ў Гродне сёння складае 22,5 тысячы рублёў. Такім чынам, арэнда кватэры плошчай 70 кв. м каштуе крыху больш за 1,5 мільёна рублёў у месяц. Гэта танней, чым на рынку здымнага жылля, і, да таго ж, арандатараў не могуць раптам папрасіць вызваліць кватэру. Дагавор на карыстанне арэндным жыллём заключаецца на 5 гадоў, і павінны быць важкія падставы, каб яго не прадоўжыць — няўплата альбо парушэнні правілаў пражывання.

Праўда, попыт на арэнднае жыллё пакуль значна апярэджвае прапанову. На 15 арэндных кватэр, якія нядаўна прапанаваліся ў Ленінскім раёне абласнога цэнтра, прэтэндавала 151 сям'я. 4 кватэры былі размеркаваны сярод маючых права на першачарговае атрыманне арэнднага жылля. Астатнія — згодна з датай пастаноўкі заяўніка на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Напрыклад, сярод сем'яў, якія атрымалі двухпакаёвую кватэру, найменшы тэрмін знаходжання ў жыллёвай чарзе адлічваецца з 26 ліпеня 2007 года.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

# У СТАЛІЦЫ ВЫБРАЛІ ПРАДПРЫМАЛЬНІКА ГОДА

## Упершыню — па версіі самага прэстыжнага ў свеце конкурсу

**Пераможцам нацыянальнага этапу міжнароднага конкурсу «Прадпрымальнік года-2014» стаў Аркадзь Добкін, старшыня савета дырэктараў EPAM Systems.**

Спачатку у лік прэтэндэнтаў на званне трапілі 120 прыкметных фігур беларускага бізнесу. Далей, згодна з умовамі конкурсу, спіс скараціўся да 67 прозвішчаў. Ім разаслалі анкеты, па выніках якіх выбралі 12 канкурсантаў. З мая па жнівень з імі праводзілася індывідуальнае інтэрв'юіраванне, і члены журы адабралі 11 фіналістаў.

Адным з членаў журы конкурсу быў старшыня праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргей Румас. Па яго словах, прапанова стаць членам журы супала з працай у банку над праграмай падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу.

«Мы ўбачылі, наколькі беларускі бізнес вырас, даведаліся аб новых прадпрыемствах, даведаліся, чым займаюцца тыя прадпрыемствы, пра якія мы ведалі раней. Калі ўлічваць, што гэты конкурс праводзіўся ў першы раз, не ўсе нашы вядомыя прадпрымальнікі заявіліся ў ім. У нас сапраўды ёсць шмат бізнесменаў, якія могуць прадстаўляць нашу краіну на міжнародным конкурсе і расказаць сваю гісторыю поспехаў», — адзначыў Сяргей Румас.

Акрамя пераможцы нацыянальнага этапу конкурсу, былі вызначаны ўладальнікі чатырох спецыяльных намінацый. Пераможцам у намінацыі «Міжнародны бізнес» стаў старшыня савета дырэктараў EPAM Systems Аркадзь Добкін, у намінацыі «Інавацыйны бізнес» — генеральны дырэктар ТАА «Софтклуб» Уладзімір Сіротка, у намінацыі «Перспектыўны бізнес» — генеральны дырэктар СТАА West Ost Union Сяргей Місячэнка, у намінацыі «Бізнес, які хутка расце» — генеральны дырэктар СП ЗАТ «Навуксофт» Мікалай Кураеў.

Пераможца нацыянальнага этапу прадставіць Беларусь у фінале міжнароднага конкурсу «Прадпрымальнік года», які пройдзе ў Манака ў чэрвені 2015 года.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

### ДЛЯ ДАВЕДКІ

**Міжнародны конкурс «Прадпрымальнік года» праводзіцца кампаніяй Ernst and Young з 1989 года і лічыцца самым прэстыжным спаборніцтвам ў галіне прадпрымальніцтва. Цяпер яго геаграфія ахоплівае 145 гарадоў у больш чым 60 краінах свету, на долю якіх даводзіцца звыш 90% сусветнага ВУП. Беларусь удзельнічала ў гэтым конкурсе ўпершыню.**

**Кампанія Ernst and Young з'яўляецца міжнародным лідарам у галіне аўдыту, падаткаабкладання, суправаджэння здзелак і кансалтынгу.**

■ Каля сенсацыі

# ДЫК ХТО ВЫЙГРАЎ КОНКУРС «МІСІС СВЕТУ-2014»?

**У чацвер сусветныя і беларускія СМІ размясцілі сенсацыйную навіну: конкурс «Місіс свету-2014», які завяршыўся 19 лістапада ў ЗША, штат Мэрылэнд, выйграла прадстаўніца Беларусі Марына Аляксейчык, абышоўшы больш за 30 канкурэнтак з розных краін свету. Са спасылкай на тэлеканал LifeNews паведамляліся некаторыя падрабязнасці пра прыгажуню: ёй 31 год, яна замужам, выхоўвае сына, працуе тэлевядучай і выступае на сцэне як спявачка.**

Аднак, калі першая хваля радасці ўлеглася, многія пільныя гледачы задаліся пытаннем: чаму ў самой Беларусі ніхто не ведае пра такую спявачку і тэлевядучую, чаму ў якасці нацыянальнага ўбору яна выбрала бела-блакітную сукенку з какошнікам і чаму ўвогуле нашу краіну прадстаўляла менавіта яна, а не «Місіс Беларусь» Юлія Перагудава?

Ні ў Нацыянальнай школе прыгажосці, якая звычайна адпраўляе айчынных прыгажунь на падобныя мерапрыемствы, ні на тэлеканале АНТ, які апошнія гады ладзіць конкурс «Міс Беларусь», а сёлета ўпершыню таксама «Місіс Беларусь» і «Містар Беларусь», пра Марыну Аляксейчык нічога не ведаюць.



Фота БЕЛТА.

*«Місіс Беларусь-2014» Юлія Перагудава сёлета не ўдзельнічае ў іншых конкурсах, затое заснавала дабрачынны фонд і актыўна прымае ўдзел у грамадскіх акцыях — напрыклад, падтрымлівае кампанію супраць абортаў.*

«Да нас як да арганізатараў нацыянальнага конкурсу прадстаўнікі «Місіс свету» не звярталіся, — расказала «Звяздзе» **дырэктар дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ,** — хаця прапановы ад аргкамітэтаў іншых конкурсаў былі і мы іх уважліва разглядалі. Аднак гэтыя мерапрыемствы падаліся нам не тое каб месцачковымі, але ўсё ж не дастаткова статуснымі для таго, каб у іх удзельнічала пераможца нацыянальнага конкурсу, якая з'яўляецца не проста эталонам прыгажосці, але яшчэ і носьбітам важных чалавечых якасцяў — дабрыні, любові, міласэрнасці... Юлія Перагудава вырашыла засяродзіцца больш на дабрачыннасці, і яна вельмі актыўна працуе ў гэтым кірунку. Аднак паколькі яе тытул дзейсны на працягу двух гадоў, то, цалкам магчыма, налета яна прадставіць нашу краіну на якімсьці з еўрапейскіх ці сусветных конкурсаў высокага ўзроўню.

Дарэчы, ужо ў гэтыя дні на конкурс Miss Supranational адправілася віцэ-міс Беларусі-2014 Крысціна Марцінкевіч, а ў снежні рыхтуецца прадставіць Беларусь на конкурсе «Міс свету» ў Вялікабрытаніі «Міс Беларусь-2014» Вікторыя Міганові. так што звычайна механізм удзелу прадстаўніц ад кожнай краіны ў знакавых конкурсах прыгажосці празрысты і зразумелы. Чаго не скажаш пра гэты выпадак.

...Больш за тое, як удалося даволі хутка высветліць праз сацыяльныя сеткі і расійскія перыядычныя выданні, Марына Аляксейчык доўгі час жыла і вучылася ў Томску і нават стала «Міс Томск-2004», удзельнічала ў конкурсе «Міс Сусвет-Расія 2005», дзе заняла 2-е месца, пасля чаго пераехала ў Маскву, дзе пачала кар'еру тэлевядучай, а пазней — і кар'еру спявачкі (праўда, ужо з іншым прозвішчам — Градская), а ў 2012 годзе пакінула як мадэльны бізнес, так і сцэну, стаўшы ўласніцай кампаніі па арганізацыі мерапрыемстваў. Цяпер, па некаторых звестках, Марына наогул жыве ў Нью-Ёрку. Пытанне, чаму яна ўдзельнічала ў конкурсе як прадстаўніца Беларусі, застаецца адкрытым.





Фота twitter.com.

**Новая «Місіс свету» Марына Аляксейчык. Безумоўна, у кожнай жанчыне павінна быць загадка, але на гэты раз яна занадта мудрагелістая.**

Нагадаем, конкурс «Місіс свету» праводзіцца з 1985 года. Асноўная яго місія, паводле сцвярджэння арганізатараў, «прапаганда сямейных каштоўнасцяў, міру, дабрыні і прыгажосці». Найчасцей карону пераможцы атрымлівалі прадстаўніцы ЗША — 6 разоў, тройчы тытул даставаўся прыгажуням з постсавецкіх краін.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК ■

■ Акцыя

# ПРАВАВАЯ АСВЕТА САМА ІДЗЕ ДА ГРАМАДЗЯН

**З 24 лістапада па 5 снежня ў краіне пройдзе рэспубліканская акцыя «Права на службу людзям». У арганізацыі і правядзенні мерапрыемства бяруць удзел міністэрствы юстыцыі і па падатках і зборах, Рэспубліканская калегія адвакатаў і Беларуская натарыяльная палата, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі.**

— Акцыя праводзіцца з мэтай удасканальвання прававой работы з насельніцтвам, развіцця сістэмы прававой асветы, забеспячэння даступнасці прававой інфармацыі. Яна стварае дадатковую магчымасць для грамадзян у атрыманні з дакладных і кампетэнтных крыніц неабходнай інфармацыі па актуальных пытаннях, — распавялі ў прэс-службе Міністэрства юстыцыі.

Напрыклад, Рэспубліканская калегія адвакатаў падрыхтавала буклет па працоўным заканадаўстве «Адказнасць наймальніка за затрымку разліку пры звальненні і выдачы працоўнай кніжкі». Беларуская натарыяльная палата стала аўтарам буклета «Што лепш: завяшчанне ці дарэнне?» Міністэрства па падатках і зборах распрацавала буклеты на тэмы: «Вы прадалі кватэру ці машыну», «Вы атрымалі спадчыну», «Ці трэба плаціць падаходны падатак, у якім памеры і калі?», «Зямельны падатак з фізічных асоб», «Падатак на нерухомасць з фізічных асоб».

Буклеты па падатковым заканадаўстве грамадзяне змогуць атрымаць у раённых (г. Мінска) інспекцыях Міністэрства па падатках і зборах. Адпаведна, па працоўным праве — будуць накіраваны ў тэрытарыяльныя калегіі адвакатаў, юрыдычныя кансультацыі, адвакацкія бюро і адвакатам, якія ажыццяўляюць адвакацкую дзейнасць індывідуальна. Беларуская натарыяльная кантора распаўсюдзіць буклеты праз натарыяльныя канторы і бюро.

Тэксты буклетаў таксама будуць апублікаваны на сайтах усіх арганізатараў акцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА ■

■ Ну і ну!

# ДЗЕЛЯ ГРОШАЙ «АДПРАВІЎ» МАЦІ НА АПЕРАЦЫЮ

**У сталіцы затрымалі 21-гадовага грамадзяніна па падазрэнні ў падмане карыстальнікаў інтэрнэту.**

Мінчанін размясціў у сеціве аб'яву пра тое, што яму тэрмінова патрэбны сродкі на лячэнне цяжка хворай маці. Ён прасіў пазычыць яму грошай, якія абяцаў вярнуць праз нейкі час з працэнтамі. Неўзабаве з аўтарам аб'явы звязалася жанчына, якая пасля размовы з ім пагадзілася перадаць 500 долараў на аперацыю. Малады чалавек паабяцаў вярнуць грошы з працэнтамі праз месяц. Аналагічным чынам ён неўзабаве падмануў яшчэ некалькіх грамадзян. Прычым у якасці тлумачэння неабходнасці тэрміновага збору грошай была не толькі «цяжкая хвароба» маці, але і хуткае «вяселле» зламысніка, а таксама развіццё «вельмі выгаднага бізнесу». Усім крэдыторам малады чалавек сродкі не вярнуў, і падманутыя грамадзяне звярнуліся ў міліцыю. Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС г. Мінска ўстанавілі, што ні цяжкага захворвання ў маці маладога чалавека, ні яго ўласнага вяселля, ні развіцця бізнесу не было. Грошы хлопец трціў на асабістыя патрэбы.

Сяргей СТАРЫНАЎ ■

■ А не шкодзь!

# Мяса лася грузіў мяхамі...

**Да паўтарагадовага тэрміну папраўчых работ прыгавораны жыхар Мінскага раёна, які незаконна здабыў лася на тэрыторыі сталічнага лясгаса.**

Мужчыну заўважыў паляўнічазнаўца, калі той грузіў мяхі з мясам у машыну. Супрацоўнік лясгаса паспрабаваў спыніць парушальніка і зафіксаваць тое, што адбывалася, на фотакамеру. За што быў збіты браканьерам. Парушальніку ўдалося збегчы, аднак яго асобу пасля ўстанавілі.

— Пры далейшым абследаванні тэрыторыі, прылеглай да месца палявання, дзяржінспектары знайшлі яшчэ чатыры мяхі з мясам, шкуру і рэшткі тушы лася, а супрацоўніcі міліцыі — бінокль, рыдлёўку і пластыкавую бутэльку з адбіткамі пальцаў, — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Падчас вобыску ў падазраванага канфіскавалі дзве паляўнічыя стрэльбы і газавы пісталет з боепрыпасамі. Пасля таго як у дачыненні да браканьера завялі крымінальную справу, той пакрыў каля 10 мільёнаў шкоды.

Сяргей РАСОЛЬКА ■

# МАЙСТАР-КЛАС ПА ДАЕННІ КАРОЎ

## праводзяць для дзяцей нямецкія і беларускія фермеры



**Мар'ян Шорман хоча, каб нехта з яе дзяцей працягнуў сямейную справу.**

**Карэспандэнт «Звязды» наведала аграсядзібу ў Паўночным Рэйне-Вестфаліі, куды прыязджаюць адпачываць не толькі сем'і, але і цэлыя школьныя класы.**

Пакуль гаспадыня Мар'яна Шорман распавядала, як яны з мужам «дайшлі да такога жыцця», я краем вока назірала за дзяўчынкай, якая вывозіла на тачцы гной з хлеўчука. Спачатку ўсе думалі, што гэта дачка фермераў дапамагае бацькам па гаспадарцы. Як высветлілася пазней, школьніца, якая прыцягнула ўвагу беларускіх журналістаў, прыехала сюды з маці на канікулы.

— Паверце, мы нікога з гасцей працаваць не прымушаем, гэта яе ўласнае жаданне, — рэагуе на пытанне фраў Шорман. — Для дзяцей і бацькоў, якія прыязджаюць да нас з дзецьмі, дапамога па гаспадарцы — вельмі папулярная забава. Нічога дзіўнага ў гэтым няма — так бавяць канікулы многія нямецкія школьнікі. Сельскі турызм з самага пачатку свайго ўзнікнення быў накіраваны на тое, каб даць магчымасць небагатаму гараджаніну недзе адпачыць. Хоць па-ранейшаму мы не адносімся да дарагіх варыянтаў, тым не менш сярод нашых гасцей бываюць і тыя, хто мог бы сабе дазволіць 4-зоркавую гасцініцу. Яны свядома прыязджаюць сюды са сваімі дзецьмі, каб малыя атрымалі нейкія новыя ўражанні. Так, сёння група дзяцей, узброіўшыся віламі, чысціла стайню, а ўчора тыя ж хлопчыкі і дзяўчаткі разам з бацькамі вучыліся даіць кароў.

Паездка на ферму на спецыяльна пераабсталяваным трактары з фургонам — любімы «атракцыён» у дзяцей. Там ім паказваюць, як дояць кароў, і нават дазваляюць паспрабаваць зрабіць гэта самім.

— У Германіі жорсткія патрабаванні да перавозкі пасажыраў, таму, каб абсталяваць фургон на 25 месцаў усім неабходным, давялося заплаціць 40 тысяч еўра. Кожны дзень, за выключэннем нядзелі (гэта дзень адпачынку, калі мы займаемся сваімі справамі), адвозім гасцей на наша сельгаспрадпрыемства. Спачатку ўсе жывёлы знаходзіліся тут, побач з домам. Але ў нейкі момант мы зразумелі, што гэта не вельмі добра сумяшчаецца. Купілі сельгаспрадпрыемства ў суседняй вёсцы, якое абанкруцілася, і перавялі туды дарослых жывёл і тэхніку, каб ліквідаваць небяспеку для дзяцей, якія бегаюць па двары.

У гаспадарцы Шорманаў, акрамя 30 кароў, яшчэ 8 коней, 5 аслоў, козы, куры, качкі, гусі,трусы, свінні, авечкі, 4 сабакі і шмат кошак. Звычайныя вяскоўцы ў Германіі жыўнасць даўно не трымаюць, таму ў нямецкіх дзяцей ёсць толькі адна магчымасць акунуцца ў сапраўднае вясковае жыццё — паехаць да фермераў.

— Вядома, убачыць жывёл можна і ў заапарку, але там дзеці могуць толькі назіраць за імі. А тут — іншая справа. Мы гаспадарка, якую можна не толькі ўбачыць, але і дакрануцца, панюхаць. Многія госці ўпершыню бачаць некаторых жывёл менавіта ў нас. Спачатку яны ўцякаюць ад курэй, а да каня ці каровы наогул баяцца падысці. У асноўным гэта дзеці, але і дарослыя, здараецца, таксама. Мы дапамагаем ім пераадолець такія страхі.

Толькі сельскагаспадарчае прадпрыемства сям'ю не змагло б пракарміць. Уласнай зямлі не так шмат, а арэнда чужой — вельмі дарагое задавальненне.

— Вось і атрымліваецца, што ў нас, па сутнасці, два незалежныя прадпрыемствы — сельская гаспадарка і гасцінічны бізнес, — якія патрабуюць розных падыходаў, у тым ліку і да выплаты падаткаў. Я параўнала б іх з парай красовак. Парвецца адзін — другі таксама давядзецца выкінуць.

Любімае месца на ферме ў дзяцей — стайня. Яны не толькі катаюцца на конях, але і з задавальненнем даглядаюць іх. Таксама дзецям падабаецца самастойна забіраць з куратніка яйкі і адносіць іх на кухню. Той, хто хоча, можа напісаць на яйку алоўкам сваё імя і атрымаць менавіта яго на сняданак. Дарэчы, на ферме падпісана кожная гаспадарчая пабудова, каб турысты ведалі, якія жывёлы там утрымліваюцца, і нават дрэвы, бо многія з іх у гарадах не растуць.

Мар'яна і яе муж працуюць не толькі з індывідуальнымі гасцямі, але і з арганізаванымі групамі, са школьнымі класамі.

— У гэтым сезоне прынялі 2000 школьнікаў. У панядзелак на сядзібу заязджаюць, як правіла, 2-3 класы разам з настаўнікамі. Застаюцца да серады. Серада для нас самы напружаны дзень, калі трэба перасцяліць усе ложкі, бо ў 11 гадзін ужо наступныя школьнікі заязджаюць. Яны застаюцца да пятніцы. А ў пятніцу ўжо прыязджаюць прыватныя госці на выхадныя. Асабліва шмат сем'яў з дзецьмі адпачываюць тут падчас школьных канікулаў. Часам да нас прывозяць дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

Пачыналі прымаць гасцей 20 гадоў таму Хубертус з Мар'янай у бацькоўскай хаце. Паступова расшыраліся, арандавалі ў вёсцы Эслоэ (якая сёння налічвае 1600 жыхароў) кватэры, якія здаюцца на лета. Затым купілі ў крэдыт яшчэ адзін дом, дзе цяпер таксама размяшчаюць турыстаў. Сёння аднячасова Шорманы могуць прыняць каля 80 чалавек.

З сакавіка да пачатку лістапада на сядзібе працуе 15 чалавек, у асноўным мігранты з Польшчы, Украіны, Латвіі, Эстоніі. Сезонныя рабочыя зарабляюць каля дзвюх тысяч еўра за месяц (без выліку падаткаў).

— Некаторыя з іх працуюць у нас і па 10 гадоў запар. Для нас важна, каб яны вярталіся, таму прапаноўваем ім добрыя ўмовы пражывання і харчаванне. Разам з тым мы стараемся асноўную працу рабіць сіламі ўласнай сям'і. У нас 5 дзяцей ва ўзросце ад 8 да 22 гадоў. Усе раслі ў маім уласным дзіцячым садзе сярод турыстаў, — усміхаецца Мар'яна. — Да тэлевізара іх не цягне, бо пастаянна заняты ў сядзібе: тут заўсёды шмат людзей, дзяцей, ёсць з кім пагуляць. У нас, дарэчы, у гасцявых пакоях наогул няма тэлевізараў, і гэта цвёрдая пазіцыя: дзеці павінны тут адпачываць, а не тэлевізар глядзець. Гэта, зразумела, не на карысць зорнасці нашых пакояў. Але мы ў першую чаргу арыентуемся на патрэбы нашых прыярытэтных гасцей — а гэта дзеці, а не дарослыя. Для іх, паверце, колькасць зорак не мае значэння.

Падчас шчырай размовы Мар'яна прызналася, што ёй хацелася б, каб нехта з дзяцей працягнуў сямейную справу. Але...

— Старэйшая дачка вырашыла звязаць сваё жыццё са светам моды, вывучае гэты напрамак. І наўрад ці будзе цікавіцца тым, што тут адбываецца. Другая вывучае гасцінічную справу, але таксама без намёкаў на тое, што яна будзе працаваць тут. Сярэдні сын, яму 18, атрымлівае прафесійную адукацыю. Ён вельмі прывязаны да нашай вёскі, але таксама кажа, што пакуль не хацеў бы браць на сябе такую адказнасць. Астатнія яшчэ вельмі маленькія. Пакуль дзеці яшчэ не ў тым узросце, каб дакладна сказаць. А вось праз 10 гадоў, спадзяюся, усё вызначыцца. Мне хацелася б своечасова адысці ад спраў, перадаць дзецям, ці, калі не будзе ахвотных, разгледзець нейкія іншыя варыянты. І ў гэтым мы супадаем з мужам — абое хацелі б паездзіць па свеце, паглядзець тое, што мы пакуль яшчэ не паспелі.

## А ЯК У НАС?

**— Ці ёсць у Беларусі падобныя сядзібы, якія арыентуюцца на юных наведвальнікаў? — пацікавілася я ў старшыні праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыі КЛІЦУНОВАЙ.**

— Тэма «школьных класаў» вельмі перспектыўная, але пакуль што не надта раскручаная. Большасць аграсядзіб пакуль спецыялізуецца на сямейным адпачынку, ладзіць сумесныя праграмы для дарослых і дзяцей. Тым не менш нашы людзі паступова намацваюць і гэтую тэму. Так, на сядзібу Васіля Фралова «Свет пчол» настаўнікі прывозяць на экскурсію поўныя аўтобусы. Дзеці з задавальненнем наведваюць музей пчол, дзе маецца нават шкляны вулей, частуюцца блінамі з мёдам... Ала Палікарпук «На Зарэчнай вуліцы» праводзіць для школьнікаў майстар-класы па прыгатаванні традыцыйных беларускіх страў. Гаспадыня сядзібы «Палескія традыцыі» Ніна Главацкая запрашае дзяцей у свой яблыневы сад, расказвае і паказвае, як даглядаць дрэвы, у сезон экскурсанты нават дапамагаюць ёй збіраць крамяны ўраджай... Праграмы для школьнікаў — вельмі патрэбная справа. Бо калі не прывучыць дзяцей змалку есці экалагічна чыстыя прадукты, не паказаць ім «шлях малака», то нацыя, лічу, шмат страціць.

**— Гаспадары сядзіб, якія вы назвалі, маюць магчымасць прыняць з начоўкай некалькі класаў?**

— З гэтым пакуль што праблема. Ведаю як мінімум дзве сядзібы — «Верас» ды «Палескія традыцыі», дзе могуць размясціць цэлы клас. У Кобрынскім раёне знайшлі іншае выйсце з гэтай сітуацыі — стварылі турыстычны кластар «Мухавецкая Кумора». Там прыкладна 12-14 сядзіб каапeруюцца і пытанне з начоўкай вялікай групы людзей вырашаюць сумесна: дзеляць, напрыклад, клас на дзве групы. Астатнія сядзібы, у тым ліку і з-за недахопу спальных месцаў, ладзяць аднадзённыя праграмы для школьнікаў.

**— А для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі сёння даступны адпачынак на вёсцы?**

— У нас ёсць 3-4 сядзібы, якія гэтым займаюцца. Возьмем, напрыклад, сям'ю Макеяў. Калі Міхась даведаўся, што ў семінары, які планаваўся на базе яго аграсядзібы, прымаюць удзел два чалавекі на інвалідных калясках, адаптаваў для іх два пакоі. З дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі не першы год працуе сядзіба «ВеЛюНа», што пад Мінскам, але гэта выключна аднадзённыя праграмы. Вельмі радуе, што ёсць сярод гаспадароў аграсядзіб тыя, якія разумеюць важнасць сумеснага адпачынку дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі і звычайных дзяцей. Так, у бліжэйшы час мы плануем рэалізаваць сумесны з арганізацыямі інвалідаў праект па адаптацыі інфраструктуры для людзей з інваліднасцю ў аграсядзібах Валожынскага раёна.

**— Гаспадыня нямецкай сядзібы вельмі перажывае, што ўласныя дзеці не захочуць працягнуць справу яе жыцця. Ці існуе ў нас праблема з пераемнасцю пакаленняў?**

— Сын гаспадара аграсядзібы «Кролава хата» скончыў лінгвістычны ўніверсітэт, стажыраваўся ў Амерыцы, а цяпер думае аб тым, каб жыць у вёсцы і займацца сельскім турызмам. У Ірыны і Міхася Макеяў дзеці таксама вучыліся за мяжой, вярнуліся і дапамагаюць бацькам. Зяць гаспадароў сядзібы «Ганка» наогул прыўнёс у сямейны бізнес новы элемент. Яго вяровачны «гарадок» над вадой прыцягнуў на сядзібу новых кліентаў, у тым ліку і дзяцей. Як бачыце, у нас хапае добрых прыкладаў. Акрамя таго, сёлета ў межах праекта USAID\ПРААН «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё» і адукацыйнай кампаніі «Простыя рэчы» правялі шмат валанцёрскіх акцый для школьнікаў, звязаных з агратурызмам. Адна з апошніх — «Школа юнага фермера» на базе сядзібы «Верас». Спачатку гаспадыня Ірына Макей прапанавала дзецям з Князеўскай гімназіі і Елкаўскай школы разам сервіраваць стол. Пасля гэтага яны вучыліся засцілаць ложкі і прыгожа дэкарыраваць тыя пакоі, у якіх будуць жыць. Прычым быў конкурс на самы прыгожы пакой. Пасля гэтага быў майстар-клас па прыгатаванні вячэры. Назаўтра яны хадзілі глядзець, як працуе фермерская гаспадарка, дапамагалі даглядаць жывёлу. Гэтая школа аказала вялізнае ўражанне на дзяцей. Вопыт, які яны набылі, неўзабаве прымянілі ў той жа сядзібе «Верас» падчас «Зялёнай гулянкі». Школьнікі сустракалі гасцей, выступалі для іх мясцовымі гідамі. Лічу, што трэба браць гэты вопыт на ўзбраенне, больш прыцягваць дзяцей у якасці валанцёраў на нашы святы, такім чынам выхоўваць, магчыма, будучых гаспадароў аграсядзіб.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**

*Мінск — Эслоэ (Германія) — Мінск.*



**Дапамога па гаспадарцы — папулярная забава сярод гасцей нямецкіх фермераў.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 10 декабря 2014 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование продаваемого имущества)** | **Самолет «CESSNA CITATION X»*, девятиместный, с двумя турбореактивными двигателями, серийный номер 750-0300, регистрационный номер OE-HAK, 2009 год выпуска, цвет белый с красным.** |
| **Начальная цена** | 22 458 909 250 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 2 200 000 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |

** Имущество реализуется без эксплуатационной (технической) документации.*

Местонахождение продаваемого имущества – территория аэропорта «Минск-1».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 10 декабря 2014 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 21.11.2014 по 08.12.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22; (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

■ Не ў кадры

# З ЧАГО РОБІЦЦА... ТЭЛЕБАЧАННЕ?

## «Звязда» распытала тых, хто працуе па той бок экрана

**У 1998 годзе Генеральная Асамблея ААН абвясціла 21 лістапада Сусветным днём тэлебачання (World Television Day) Дзяржавам прапаноўвалі адзначаць гэты дзень, абменьваючыся тэлевізійнымі праграмамі, прысвечанымі праблемам міру, бяспекі, эканамічнага і сацыяльнага развіцця, пашырэнню культурнага абмену.**

З нагоды свята мы вырашылі пагаварыць з тымі прафесіяналамі, якія працуюць не ў кадры, але робяць сучаснае тэлебачанне менавіта такім, якім мы яго бачым.



Фота Надзеі БУЖАН.



**Алена ФУРСАВА, кіраўнік часовых творчых груп праграм «Калыханка» і «Дабранак» тэлеканала «Беларусь 3»:**

— Я на тэлебачанні ўжо амаль трыццаць гадоў і ўвесь гэты час звязана з дзіцячай рэдакцыяй. Працавала і ў кадры, і за ім, і скажу вам: за кадрам бывае не менш цікава. Мой муж неяк паглядзеў выпуск праграмы «Дабранак» і кажа: «Як у вас добра госці гавораць!», а я ведаю, што часам перапісваць іх даводзіцца па дзесяць разоў. Бо людзі ў кадры, асабліва без звычкі, часта губляюцца і забываюць нават нейкія элементарныя рэчы. Даводзіцца настройваць госця, супакойваць яго, а потым глядзіш на экран — там усё прыгожа. Нельга дасягнуць прыгажосці ў кадры без творчай працы рэжысёра, мастака, аператара, грымёра. Проста няўдала выстаўленае святло можа адбіцца на вобразе вашага героя, а грым можа састарыць чалавека ці змяніць яго да непазнавальнасці.

Калі казаць непасрэдна пра маю працу, то я кірую творчай групай людзей, якія ствараюць праграмы «Дабранак» і «Калыханка». Адказваю за ўсё, вычытваю і рэдагую сцэнарыі, раблю тэматычны план, размяркоўваю мультфільмы для кожнага выпуску і гэтак далей. Здарыцца можа ўсякае: бывала раней падчас прамых эфіраў не выключалася камера, і тады даводзілася імправізаваць і працягваць размову ў кадры. Альбо неяк прынеслі мы кошку на здымкі, яна патрэбна была ў праграме. А тая спужалася і схавалася ў дэкарацыях. Потым недзе тыдзень прыносілі ёй туды ежу і чакалі, пакуль яна выйдзе са сваёй схованкі, каб вярнуць гаспадару... Самае важнае, пра што трэба памятаць, працуючы з дзецьмі, — ніколі іх не падманваць. Бо яны заўсёды адчуюць тваю няшчырасць і закрыюцца. Для дзяцей нашы героі сапраўды жывыя! Неяк у нас былі здымкі праграмы ў музеі, і там актрыса працавала не пад сталом, а, так бы мовіць, адкрыта. Але дзіця бачыць толькі ляльку, размаўляе з ёю, а дарослай цётачкі нібы «не існуе»! Такую веру і магію не хочацца разбураць.

А наогул работа на тэлебачанні патрабуе ўмення быць часткай каманды, якая, бы ў гадзіннікавым механізме, павінна дзейнічаць зладжана. Тут важна, каб побач былі людзі, з якімі вы глядзіце ў адным напрамку. Тады нават стомленасць узнагароджваецца задаволенасцю вынікам.



**Святлана ГРЫНЧЫК, рэдактар праграмы «Беларуская часінка», тэлеканал «Беларусь 1»:**

— Кожны эфір праграмы пачынаецца з тэмы, якую мы абмяркоўваем, плануем здымкі сюжэтаў. Як правіла, тэмы падказваюць самі гледачы, калі звяртаюцца ў праграму і расказваюць пра свае праблемы. Так фарміруецца тэматыка кожнага дня.

Падчас прамых эфіраў тэлефонныя званкі ад аўдыторыі прымаюць нашы карэспандэнты. Бывае так, што людзі тэлефануюць і расказваюць сваё бачанне, а пасля выезду на здымкі высвятляецца, што праблема мае зусім іншы характар. І таму часам не пазбегнуць сітуацый, у якіх героі застаюцца незадаволенымі. Нашы карэспандэнты імкнуцца аб'ектыўна падыходзіць да асвятлення і даследавання кожнай сітуацыі. Бываюць непаразуменні і ў сувязі з тым, што некаторыя гледачы звяртаюцца да нас, а потым адмаўляюцца здымацца ў сюжэце... У выпадку атрымання згоды на здымкі шукаем абавязкова спецыялістаў, якія могуць нейкім чынам уздзейнічаць на сітуацыю і патлумачыць, як такое адбылося. Са знятым сюжэтам карэспандэнт перад мантажом прыходзіць да рэдактара (іх на праекце два) — гэты чалавек курыруе ўвесь працэс. Калі не патрабуюцца ўдакладненні, дапрацоўкі, то матэрыял рыхтуецца для праграмы.

Працаваць на тэлебачанні нялёгка, бо аб'ём задач вялікі: трэба трымаць пад кантролем працу карэспандэнтаў, пісаць тэксты для вядучых і разбірацца з імі ў праблемных сітуацыях, якія плануем паказваць у эфіры. Кампанія людзей, з якімі мы працуем над праграмай, — гэта прафесіяналы, яны кожную гісторыю прапускаюць праз сябе і імкнуцца знайсці выйсце, дапамагчы гледачам. Так, нашаму прадзюсару Людміле Барадзіной часам даводзіцца браць «удар» на сябе (калі, напрыклад, героі сюжэтаў застаюцца незадаволенымі). Карэспандэнты не проста здымаюць сюжэт, а і адсочваюць лёс герояў. Ну а вядучыя працуюць кожны дзень у прамым эфіры, падымаюць і агучваюць болевыя кропкі нашага жыцця. І калі ўдаецца дапамагчы чалавеку, то гэта дае новыя сілы, натхненне і ўпэўненасць, што ўсё робім недарэмна.



**Генадзь САЛДАТАЎ, выканаўчы прадзюсар Беларускага прадстаўніцтва тэлеканала «Мір»:**

— Я ваенны журналіст. У свой час скончыў Львоўскае ваенна-палітычнае вучылішча, служыў на Ціхаакеанскім флоце. Пасля распаду Савецкага Саюза пераехаў у Беларусь, працаваў у ваеннай газеце. Але разам з тым заўсёды марыў здымаць дакументальнае кіно. Праз нейкі час на маім шляху сустрэўся чалавек, які паверыў у мяне, і я апынуўся на тэлебачанні.

Самае важнае, пра што варта памятаць, працуючы тут, — гэта каманда, часткай якой ты з'яўляешся. Варта хаця б аднаму чалавеку ў нечым недапрацаваць — тады нічога не атрымаецца. Я, як выканаўчы прадзюсар, арганізоўваю працэс стварэння таго ці іншага праекта на тэлебачанні. Таму вельмі важна перш за ўсё самому быць арганізаваным, дысцыплінаваным і адказным. Гэтаму якраз навучыла служба. У працэсе працы заўсёды бываюць незапланаваныя моманты. Мы неяк здымалі фільм пра перадавенныя падзеі 1939 года. Здымкі праходзілі ў Брэсцкай крэпасці. І вось наш вядучы на фоне варот крэпасці расказвае пра той час — а тут у кадры з'яўляецца вялікі строй нямецкіх салдат. Відаць, там здымалі нейкі мастацкі фільм, і людзі з масоўкі некуды перамяшчаліся. Тым самым мы сэканомілі на масоўцы — і сцэна прыгожая атрымалася.



**Сяргей ЗЛОТНІКАЎ, тэлеаператар:**

— За гады маёй працы на тэлебачанні было шмат цікавых і яркіх праектаў. Здымалі гісторыка-геаграфічныя серыялы кшталту «Энцыклапедыя гарадоў Беларусі», «Знаёмцеся, Беларусь», таксама з яркіх — праца над дакументальным фільмам «Шчасце недзе за вуглом» пра нелегальную міграцыю ў нашай краіне і ў Амерыцы...

Праца аператара не з лёгкіх і не заўсёды варта чакаць, што ее ацэняць як належыць. Увогуле, тэлебачанне — гэта канвеер, дзе кожны чалавек з каманды, якая працуе, напрыклад, над праектам, выконвае сваю задачу. Ты дзейнічаеш паводле прафесійных законаў, але ёсць магчымасць і імправізаваць. Я люблю параўноўваць працу аператара з выразаннем драўляных кубікаў дзіцячай азбукі, дзе літара — гэта карцінка. І мая задача — знайсці столькі карцінак, каб пры мантажы аўтар і рэжысёр маглі складваць патрэбныя «словы». Абмеркаваннем таго, якія карцінкі нам патрэбны, рэжысёр і аператар займаюцца часта проста па дарозе на месца здымак. Рэжысёр ставіць перада мной задачу, а я вырашаю ўжо, як буду над ёй працаваць, калі нашы погляды супадаюць, то дзейнічаем альбо шукаем яшчэ нейкі варыянт.

Калі працуеш на тэлебачанні, то становішся залежным ад патоку навін, кантактаў, цынічным у пэўнай меры, бо бачыш розныя праявы жыцця. Часам стамляешся ад гэтага, але я вось неяк паспрабаваў папрацаваць у офісе — і мяне хапіла толькі на месяц. А тут увесь час нейкі рух.



**Яўгенія СЯМЕНЧАНКА, рэдактар, адказная за выпуск праграм «Добрай раніцы, Беларусь», «Дзень у вялікім горадзе», «Тэлераніца» і «Тэлебарометр»:**

— Калі трэба людзям патлумачыць, чым я займаюся на працы, то кажу, што пішу тэксты, якія агучваюць іншыя. А яшчэ рэдактар у адрозненне ад рэжысёра, напрыклад, адказвае не на пытанне «як», а на пытанне «што»? Што менавіта будзе адбывацца ў кадры, як гэта будзе сфармулявана і агучана, з якім падтэкстам і ў якім парадку выкладзена... Таму для мяне тэлебачанне — гэта вялікая фабрыка, дзе працуюць тысячы людзей, якія аб'ядноўваюць ідэі, словы, карцінкі ў гатовыя праграмы. Працаваць тут марыць многія, уяўляюць сябе на месцы тэлевядучых, а ты гэтае тэлебачанне робіш. Працуеш па 24 гадзіны ў суткі, не адыходзячы ад камп'ютара, у дарозе, ахвяруючы сном, у прамым эфіры, у апошні момант, але робіш, і гэта сапраўдны драйв! Безумоўна, вялікі мінус, які не ўсе прымаюць на тэлебачанні, — гэта ненармаваны працоўны дзень. Бо ты можаш класціся спаць, калі ўсе толькі прачынаюцца, працаваць у святы, у выхадныя, не бачыцца з сябрамі і роднымі, але тэлебачанне патрабуе тваёй прысутнасці тут і цяпер. Нават з улікам таго, што за кадрам можа здарыцца самае неверагоднае, гледачы ўсё роўна атрымаюць сваю праграму і ні пра што не здагадаюцца.



**Мікалай ГЕЛІН, гукарэжысёр студыі тэлебачання прадстаўніцтва МДТРК «Мір» у Беларусі:**

— Гукарэжысёр на тэлебачанні — прафесія на першы погляд незаўважная, бо глядач спачатку бачыць карцінку, а потым ужо чуе гук. І менавіта з дапамогай гукаў малюецца агульная карціна, бо тое, што адсутнічае ў кадры, можна паказаць гукамі, шумам, музыкай, ствараючы патрэбную атмасферу. Наша задача таксама і ў тым, каб добра «гучалі» вядучыя ў кадры, госці той ці іншай праграмы. Зразумела, як і ў любой прафесіі, не абыходзіцца без форс-мажорных сітуацый. Узяць, напрыклад, прамы эфір. З улікам таго, што ўсё адбываецца тут і цяпер, да працы трэба падыходзіць вельмі адказна і быць вельмі засяроджаным на працэсе. Галоўны «сакрэт» — трэба любіць сваю справу і не дапускаць абыякавага стаўлення да яе. Калі казаць пра маё бачанне тэлебачання з пазіцыі чалавека, які знаходзіцца за кадрам, то гэта вялікая сям'я. Тут усё будуецца на чалавечых узаемаадносінах. І толькі добрае стаўленне адно да аднаго можа быць асновай і гарантыяй, што ў выніку ваша праца будзе задавальняць усіх.

**Падрыхтавала Алена ДРАПКО** ■

## СЕРАДА, 26 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.05** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Зроблена ў СССР».**
**12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Такое звычайнае жыццё». Заключная серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.15 Серыял «Сваты 3».**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.25** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**23.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**1.05** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 1.50** Тэлебарометр.
**9.05, 16.35 Серыял «Сашка».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.45 Дэтэктыў «Асабістыя матывы».**
**11.45 Камедыя «Вялікі Бак Ховард».**
**13.25** «Разбуральнікі міфаў».
**14.30** Вышэй за дах.
**15.05, 18.45, 22.10 Серыял «Універ».**
**15.40** Рэпарцёр.
**16.30** Хачу ў тэлевізар.
**17.45 Серыял «Таксі».**
**19.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Зеніт» (Расія) — «Бенфіка» (Партугалія).
**22.00** Спортлато 5 з 36.
**22.05** КЕНО.
**22.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Арсенал» (Англія) — «Барусія Дортмунд» (Германія).
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.
**1.50** Тэлебарометр.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.45** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.50, 19.20, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.00, 19.30** «Музычны скарб Беларусі».
**8.20 «Чужая радня». Меладрама.**
**9.50, 17.40** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.15 «Дзікае паляванне караля Стаха». Драма.**
**12.25, 23.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Юрыя Семянякі.
**13.05** «Музеі Беларусі». Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы.
**13.35** «Наперад у мінулае».
**14.00 «Паром». Кароткаметражны фільм.**
**14.40** «Дар'я Домрачава. Прадстаўляючы Беларусь». Дак. фільм.
**15.30** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Асвейскі».
**15.55** «Кніга лёсаў. Зямля маіх залатых бяроз». Мастак Анатоль Бараноўскі.
**16.25** «Навукаманія». Перспектывы беларускай навукі XXI стагоддзя.
**16.50 «Тры талеры». Маст. фільм.**
**18.10** «Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь збірае сяброў». Канцэрт.
**19.40 «Сто радасцяў, ці Кніга вялікіх адкрыццяў». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.10, 22.40 «Лятучая мыш». Камедыя.**
**22.15** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Спорт-кадр.
**8.30, 22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.
**9.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. БАТЭ (Беларусь) — «Порту» (Партугалія).
**11.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. ЦСКА (Расія) — «Рома» (Італія).
**13.10** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**14.55** Козел пра футбол.
**15.10** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва» (Мінск) — «Металург» (Жлобін).
**17.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Манчэстэр Сіці» (Англія) — «Баварыя» (Германія).
**18.55** Баскетбол. Еўрачэлендж. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Ушак» (Турцыя).
**20.45** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама» (Мінск).
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Зеніт» (Расія) — «Бенфіка» (Партугалія).

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Зайцаў+1».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Цудатворац».**
**23.10** «Легенды Live». Lenny Kravitz.
**23.50 Камедыя «Адчайная хатняя гаспадыня».**
**1.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 13.50, 20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Фінал.
**9.05** «Мінск і мінчане».
**9.35** «Цэнтральны рэгіён».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.55 Камедыя «Чалавек-аркестр».**
**15.35** «Татальны распродаж».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Нам і не снілася»: «Страчаныя».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.20 Маст. фільм «Ванька Грозны».**
**22.15** «Глядзець усім!».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.20** «Скардзіцца дазваляецца».
**23.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**0.30 «Меч». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Зроблена ў СССР».
**9.10 Маст. фільм «Цыганскае шчасце».**
**10.30 Маст. фільм «Каціны вальс».**
**12.10 Серыял «У свеце ежы».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**13.15, 0.40 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 2.25 Серыял «Іншы свет».**
**15.30, 2.50 Серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».**
**16.20, 23.40** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.10 Серыял «Людзі Шпака».**
**19.20, 3.20 Серыял «Апантаны».**
**22.00 Маст. фільм «Жанчын крыўдзіць не рэкамендуецца».**
**0.30** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Сучаснае вербаванне. Асцярожна — зомбі!».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.15** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Нацыянальная кухня. Ці памятаюць гены, што мы павінны есці?».
**16.40** «Факты».
**17.15** «Мая планета».
**17.50 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Каменская».**
**21.50 Серыял «Кацярына».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.20** «Пракурорская праверка».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.30** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.40** «Справа густу».
**15.10, 21.45** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.40, 16.35 Серыял «Ляснік».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.50 Серыял «Ліцейны».**
**22.25** Анатомія дня.
**23.20 Серыял «Правілы згону».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.10, 19.00, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30, 19.10 Серыял «Шэрлак».**
**9.05, 17.30** «Навіны».
**9.15** «Кінаблакнот».
**9.30 Серыял «Міс Марпл».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Меладрама «Мільянер з трушчоб».**
**13.05 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**15.15, 18.45** «Тэлемагазін».
**16.25** «TUT.BY прадстаўляе».
**16.45 Серыял «Эўрыка».**
**17.40 Серыял «Смерць у раі».**
**19.00** «Тэлепрагноз».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Прыгоды «Выпрабаванне каралеўскага стралка Шарпа».**
**23.00 Серыял «Незямны сёрфінг».**

### ВТБ

**6.00, 5.50** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 19.30** Серыял «Кухня».
**9.30, 13.30, 19.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**10.00, 20.00** Серыял «Варонiны».
**11.00, 5.00** «Празорлівая».
**12.00, 1.00** Серыял «Метад Лаўровай».
**14.00, 18.30** «Лаві момант».
**14.30, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Камедыя «Сардэчна запрашаем на поўдзень».
**21.10** Меладрама «Прыкінься маім хлопцам».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**5.20** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.15** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.05, 20.10** «Правілы жыцця».
**12.40** «Красуйся, горад Пятроў!».
**13.05, 21.20** «Космас — падарожжа ў прасторы і часе». Дак. серыял.
**13.50** «Сава Марозаў». Маст. фільм.
**14.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.10** Academia. Сяргей Карпаў. «Цывілізацыя Візантыі». 1-я лекцыя.
**15.55** Пісьменнікі нашага дзяцінства. Валянцін Берастаў.
**16.25** Штучны адбор.
**17.05, 22.45** «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
**17.40** Да 80-годдзя з дня нараджэння Альфрэда Шнітке. Concerto grosso № 2.
**18.15** «Больш, чым каханне». Клемянціна і Уінстан Чэрчыль.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Абсалютны слых».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** «Сустрэча на вяршыні».
**22.00** Улада факта. «Чалавек у турме».
**23.35** «Ван Гог». Маст. фільм.
**1.15** Канцэрт камернага ансамбля «Берлінскія барочныя салісты» ў Сочы.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «...Да 16 і старэйшым». 1990 год.
**6.50** «Спявае Надзея Чапрага». 1993 год.
**7.20, 13.25** Маст. фільм «Сумленне».
**8.35, 19.25, 5.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 17.00** «Песня-89».
**12.00** «Яловая субмарына». Гісторыя рускага рока». «Майк з групы «Заапарк». 2005 год.
**13.05** Дак. фільм «Ангарскія лесарубы».
**18.00** «Міжнародная панарама». 1978 год.
**18.45** «Грымучы тузін». Фільм-канцэрт. 1988 год.
**19.50** Тэлеспектакль «Залатая рыбка». 1985 год.
**23.00** «Нам рана жыць успамінамі». Фільм-канцэрт з удзелам Э. П'ехі. 1987 год.
**0.00** «Алё, мы шукаем таленты!». 1972 год.
**1.20** Гумарыстычная праграма «Не смешна». «Перад люстэркам». 1980 год.
**1.50** Фільм-канцэрт «Рыкі Э Поверы». 1986 год.
**3.00** Маст. фільм «Мера стрымання».
**4.20** «У гасцях у клуба «Што? Дзе? Калі?». 1986 год.

### EUROSPORT

**10.45** WATTS.
**11.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы.
**14.00, 2.30** Футбол. «Манчэстэр Сіці» (Англія) — «Баварыя» (Германія).
**15.00, 0.20** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**16.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы.
**19.00** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**21.00** Кампус.
**21.30, 23.45** Выбранае па серадах.
**21.35** Конны спорт. Кубак свету па выездцы.
**22.50** Навіны коннага спорту.
**22.55** Гольф. Еўрапейскі тур.
**23.25** Гольф-клуб.
**23.30, 23.50** All Sports.
**23.35** Яхт-клуб.
**1.30** Спартыўны курорт.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
**7.00** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**8.25** Камедыя «Маленькі свет».
**10.25, 14.30, 17.30, 22.00** Серыял «Татуся».
**10.55** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**12.50** Камедыя «На кручку».
**15.30** Камедыя «Брусель — ЗША».
**17.10, 20.00, 22.50, 0.50** Скетчком «Паміж намі».
**18.30** Камедыя «Замарожаныя».
**20.20** Камедыя «Я і яго былыя».
**22.30** Серыял «Пэт і Кэбедж». 1-я серыя.
**23.10** Камедыя «Усе выраслі».
**1.15** Камедыя «У нагу!».
**4.10** Камедыя «Містар Лёс».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00, 14.25, 4.00** «Доктар І...».
**8.25, 18.55, 1.45** «Каханне і пакаранне». Серыял.
**9.55, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45, 17.55** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.45, 16.55** «Шчырая размова».
**13.40** «Аўрора». Серыял.
**14.55, 0.10** «Каменская». Серыял.
**15.55, 22.30, 3.10** «Зорныя гісторыі».
**20.35** «Берагі маёй мары». Серыял.
**21.30, 1.00** «Галоўны калібр». Серыял.
**23.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### TV 1000 ТБ1000

**6.00, 13.45** Меладрама «Двухсотгадовы чалавек».
**8.20** Камедыя «Сімона».
**10.25** Трагікамедыя «Гуманітарныя навукі».
**12.10** Камедыя «Як па масле».
**16.00** Трагікамедыя «Вундэркінды».
**17.55** Драма «Мой хлопец — псіх».
**20.05** Меладрама «Сямейка Джонс».
**21.50** Камедыя «Ромавы дзённік».
**0.00** Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».
**2.05** Баявік «Чалавек-павук».
**4.20** Камедыя «Жывёла».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
**8.20** Драма «Дзяўчына і смерць».
**10.35** Камедыя «Навагодняя жонка».
**12.20** Прыгоды «Вязень замка Іф».
**16.40** Драма «Шагал — Малевіч».
**18.50** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**20.20** Трагікамедыя «Аддаць канцы».
**22.10** Драма «Адкупленне».
**0.20** Трылер «Апошні ўікэнд».
**2.10** Драма «Царэвіч Аляксей».
**4.10** Драма «Гогаль. Найбліжэйшы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.00, 19.00, 21.00, 1.00, 4.00** Мегазаводы.
**7.00, 13.00** Гульні розуму.
**7.30, 13.30** Займальная навука.
**8.00** Зрабі або памры.
**8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**9.00, 14.00** Больш чым фокусы.
**10.00, 15.00** Карысныя парады Дэвіда Рыза.
**12.00** Золата Юкана.
**16.00** У пошуках марскога супердрапежніка.
**17.00** Смяротна небяспечны тузін.
**18.00, 3.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**20.00** Цяжкае золата Аляскі.
**22.00, 2.00, 5.00** Шаша праз пекла.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Турэмныя наглядчыцы.

### DISCOVERY

**8.00, 10.35** Залатая ліхаманка.
**8.50** Аўтападполле.
**9.40, 14.15, 21.35** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.40, 21.05, 5.45** Як гэта зроблена?
**11.30, 6.10** Навука магіі.
**12.25, 17.25, 22.00** Склады.
**13.20, 1.55** Top Gear.
**15.10, 4.55** Курс экстрэмальнага ваджэння.
**16.05, 7.05** Махінатары.
**18.20** Поўны фарсаж.
**19.15** Вялікі махінатар.
**20.10** У пагоні за класікай.
**23.00** Прапажы на продаж.
**0.00** Бітвы за кантэйнеры.
**1.00, 4.05** Багажныя войны.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.

## Гараскоп на

**АВЕН.** Тыдзень поўны праблем, якія далёка не заўсёды можна будзе лёгка вырашыць. Будзеце схільныя кідацца з боку ў бок, брацца за розныя справы, не даводзячы нічога да канца. Таксама рызыка быць нястрыманым у словах, што можа прывесці да канфлікту з навакольнымі. У першую чаргу неабходна навучыцца трымаць сябе ў руках, кантраляваць свае парывы. Становішча ў матэрыяльнай сферы да канца тыдня таксама будзе хісткім, варта быць акуратнымі ў выдатках.

**ЦЯЛЕЦ.** Чарговы руцінны тыдзень, напоўнены гарой розных дакументаў, якія неабходна разбіраць. У гэты час добра заключаць дагаворы і здзелкі, нават на словах, бо зможаце праявіць асаблівую ўважлівасць да дробязяў. Да таго ж дамоўленасці абяцаюць быць карыснымі і трывалымі. Бліжэй да канца тыдня адкрыецца другое дыханне, што дазволіць дастаткова хутка разабрацца з назапашанымі справамі і ўзяцца за штосьці новенькае, тым самым падвёўшы вынік тыдня на сваю карысць.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вы занадта засядзеліся на адным месцы і перасталі варушыцца, адчуваеце сябе камфортна і не хочаце нічога рабіць, каб рухацца далей. Менавіта таму могуць адбыцца не вельмі прыемныя падзеі, якія разбураць звыклае становішча рэчаў. Тым не менш зможаце лёгка перажыць гэтае здарэнне, калі не станеце чапляцца за старое. Вось убачыце, да канца тыдня ўсё складзецца найлепшым чынам, і вы адкрыеце для сябе значна больш магчымасцяў, чым было раней.

**РАК.** Абудзяцца старыя пачуцці. Для аднаўлення і наладжвання адносін лепш за ўсё падыходзіць пачатак тыдня. Гэты ж час спрыяльны і для падтрымання ўзаемасувязі са старымі сябрамі або сваякамі. Можаце разлічваць на іх падтрымку, у тым ліку і матэрыяльную. А яна, дарэчы, будзе зусім не лішняй.

**ЛЕЎ.** Ваша ўплывовасць і магчымасць кіраваць навакольнымі людзьмі і працэсамі павялічыцца ў значнай ступені, але, тым не менш, варта быць асцярожнымі і не перагінаць палку. Будзе не адна магчымасць зрабіць што-небудзь на выгаду сабе, але глядзіце, каб вашы ўчынкі не нашкодзілі іншым, інакш гэта можа адбіцца на вас у далейшым (хоць на першы погляд усё і будзе выглядаць добра і бяскрыўдна). У канцы тыдня павялічваецца ваша прывабнасць для супрацьлеглага полу, гэты час можна правесці ў рамантычных абставінах.

**ДЗЕВА.** Спрыяльны і спакойны тыдзень, які пройдзе ў размераным тэмпе. Варта праяўляць актыўнасць у пытаннях дабраўпарадкавання жылля або іншых дзеяннях, так ці інакш звязаных з домам і сям'ёй, бо гэты кірунак будзе максімальна паспяховым менавіта ў гэтыя дні. Зносіны з блізкімі сябрамі і роднымі прынясуць шмат прыемных уражанняў і створаць добры настрой на ўвесь тыдзень.

## СУБОТА, 29 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.55** Існасць.
**7.20 Меладрама «Павуцінка бабінага лета».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 23.15 Серыял «Байкі Міцяя».**
**10.55** «Аб ежы!».
**11.30** Кулінарная дыпламатыя.
**12.10** Гісторыі рамонту.
**12.45** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.25** БеларусьLIFE.
**13.55** «Зорнае жыццё». «Правілы ўдачнага разводу».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Беларусь у развіцці».
**16.05, 0.35** «Вялікая розніца».
**17.15 Меладрама «Нялюбы». 1-я — 4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Чортава кола».**
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.55 Фільм-казка «Там, на невядомых дарожках...».**
**8.05** Толькі для дарослых.
**8.25** М/с «Аватар: Легенда аб Аанге».
**9.45** Беларуская кухня.
**10.20, 21.05** Тэлебарометр.
**10.25, 21.40 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**12.05** Капейка ў капейку.
**12.40** «Бітва экстрасэнсаў».
**14.15** Вось гэта дзіва!
**14.50 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**17.20** «Comedy woman».
**18.25** Ікра.
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** «Сустрэча з...» Зоя Луцэвіч.
**20.40** Кіпень.
**21.00** КЕНО.
**21.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.20 Баявік «Перавозчык 2».**
**0.45** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.50, 15.35, 23.45** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.00, 15.45** «Музычны скарб Беларусі».
**8.15** «Таямніца душы». Храм — помнік Першай сусветнай вайны.
**8.40 «Дэзерцір». Маст. фільм.**
**9.55** «Камертон». Ніна Ананіашвілі.
**10.20** «Жыццё з кіно. Народны артыст СССР Рэгімантас Адамайтыс».
**10.45 «Усходні калідор». Драма.**
**12.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.10** «Людзі і манекены». Мініяцюры, інтэрмедыі і маналогі ў выкананні Аркадзя Райкіна і яго трупы. 3-я серыя.
**14.10 «Ульзана». Вестэрн.**
**15.55** «Музеі Беларусі». Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага.
**16.20** «Свет прыроды». Маленькі зімовы сюжэт.
**16.35** Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча.
**17.45** «Дыя@блог P.S.».
**18.10 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**20.45** Калыханка.
**21.10 «Павуцінне хлусні». Драма.**
**23.20** «Кінарэжысёр Барыс Сцяпанаў». Фільм-партрэт. Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.00** PRO спорт. Навіны.
**9.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**9.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Хімік-СКА» (Наваполацк) — «Юнацтва» (Мінск).
**11.50** Піт-стоп.
**12.15** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**12.45** Фактар сілы.
**13.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. БАТЭ (Беларусь) — «Порту» (Партугалія).
**15.00** Еўрапейскі покерны тур.
**15.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «БГК імя Мяшкова» (Беларусь) — «Лагронья» (Іспанія).
**17.30** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск, Беларусь) — «Мядзвешчак» (Харватыя).
**19.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сандэрленд» — «Чэлсі».
**22.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вэст Бромвіч» — «Арсенал».
**0.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Хал Сіці».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.20** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** «Бацькоў у школу!».
**13.45** «У наш час».
**15.15** «Рассмяшы коміка».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Вялікія гонкі».
**17.50** «100 мільёнаў».
**18.45** Нацыянальная музычная прэмія «Ліра».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.50** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі».
**0.05 Маст. фільм «Паляўнічы».**

### СТБ

**6.25 «Студэнты 2». Серыял.**
**7.20 Камедыя «Вайна прыгажунь».**
**9.00, 13.40** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Фінал.
**9.05** «Чыстая праца».
**10.00** «Іншая краіна». «Добрай раніцы, В'етнам!».
**10.35** «Гэта мой дом».
**11.10** «Дарагая перадача».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.45 Маст. фільм «Дайце кнігу скаргаў».**
**15.30** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** «Ежа багоў».
**18.25** «Разумней не прыдумаеш. «Белы сезон».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Гарады, якія спяваюць». Фінал.
**22.40** «Глядзець усім!».
**23.20** «Зорны рынг. Бітва хітоў». Група «Баварыя» супраць групы «Gabriel K.».
**0.35 Трылер «Пункт прызначэння 4».**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.45** «Зямля і неба».
**8.10** «Саюзнікі».
**8.35** «Сабака ў доме».
**9.00** «Скажыце, чаму?».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.40 Маст. фільм «Шклянка вады».**
**12.55 Серыял «Пярсцёнак з бірузой».**
**16.15 Серыял «Адкрыцці».**
**21.45 Серыял «Забіць Дразда».**
**1.25 Маст. фільм «Копія дакладная».**
**3.20 Маст. фільм «Светлы шлях».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.10 Маст. фільм «Кветкі запозненыя».**
**9.05 Маст. фільм «Нявеста майго жаніха».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Планета сабак».
**12.20 Маст. фільм «Добры дзень, доктар!».**
**14.25 Серыял «Мора па калена».**
**16.15** «Гэта смешна».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45 Маст. фільм «Зоркі свецяць усім».**
**22.45 Маст. фільм «Цілі-цілі цеста».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05 Серыял «Гончыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25 Серыял «Дзяржаўная абарона».**
**14.20** «Я худзею».
**15.25** «Паедзем, паядзім!».
**16.20** «Вочная стаўка».
**17.05** «Кантрольны званок».
**18.00** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**21.10 Маст. фільм «Шпількі-3».**
**23.05** «Вакцына ад тлушчу».
**0.05** «Тайны кахання: Разбітае сэрца Нікаса Сафронава».
**0.55** «Мужчынская годнасць».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.15, 19.05, 20.55, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** Тэлепрагноз.
**9.10** «Мультпарад».
**9.30** Прыгоды «Алмаз Джэру».
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Камедыя «Марлі і я».**
**13.20** Прыгоды «Апошні з магіканаў».
**15.20** «Кінаблакнот».
**15.30** «Тэлемагазін».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Камедыя «Амерыканская дачка».**
**18.15 Серыял «Эўрыка».**
**19.10 Маст. фільм «Філадэльфійскі эксперымент».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.10 Трылер «Палонніцы».**

### ВТБ

**6.00, 5.00** «PLAY».
**8.00** «Галоўныя людзі».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** Серыял «Татавы дочкі».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Сябры па кухні».
**12.30** Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
**15.00** Камедыя «Помста пушыстых».
**17.00, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Васьмідзясятыя».
**20.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**20.30** Фэнтэзі «Цудоўныя стварэнні».
**23.30** «Без вежы».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** «Людзі ХЭ».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Доўгі дзень». Маст. фільм.
**12.00** Да юбілею Юрыя Васільева. Вялікая сям'я.
**12.55** Пернікавы домік. «Наіўныя гісторыі».
**13.25** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
**13.50** Аляксандр Дамагараў, Вольга Кабо, Сяргей Вінаградаў у спектаклі тэатра імя Масавета «Сірано дэ Бержэрак».
**16.20, 1.55** «Жыццё па законах джунгляў. Камерун». Дак. фільм.
**17.20** «ФаінаРанеўская». Дак. фільм.
**17.55** «Падкідыш». Маст. фільм.
**19.10** Вялікая опера. Фінал і гала-канцэрт у Вялікай зале Кансерваторыі. (У перапынку — «За кулісамі праекта». Дак. фільм).
**22.10** Галоўная роля. Спецвыпуск з Кансерваторыі з пераможцам «Вялікай оперы».
**22.30** Да 80-годдзя з дня нараджэння Вячаслава Нявіннага. «Стары Новы год». Маст. фільм.
**0.45** Дэвід Боўі. Падарожжа ў рэальнасць.
**1.40** «Аркадзія». «Дадатковыя магчымасці пятачка». М/ф для дарослых.
**2.50** «Антуан Ларан Лавуазье». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Відавочнае—неверагоднае». 1978 год.
**7.10** Фільм-канцэрт «Спявае Ліл Іванова». 1970 год.
**7.30** Фільм-спектакль «Тэатральныя гісторыі». Па аповедах А.П. Чэхава. 1976 год.
**8.20** Фільм-канцэрт «Спявае Валерый Лявонцьеў». 1991 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** Праграма «Тэма» з У. Ліcцьевым. Пра праблемы платнай медыцыны ў краіне. 1992 год.
**11.45** «Спявае салістка ленінградскага ВІА «Поющие гитары». І. Панароўская». 1975 год.
**12.00** Дак. фільм «Заўсёды з народам».
**13.00** Маст. фільм «Цвецік-сяміцвецік».
**13.30** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
**16.00** «Колба часу».
**17.05** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1983, 1985 і 1986 гадоў.
**18.00** «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ». «Музыка і мультыплікацыя». 1983 год.
**19.50** Тэлевізійная гульня «Што? Дзе? Калі?». 1982 год.
**21.00** Маст. фільм «Не чакалі, не гадалі».
**22.30** Праграма «А». 1990 год.
**23.40** Фільм-канцэрт «Старадаўнія рускія рамансы». 1982 год.
**0.00** «Міжнародная панарама». 1978 год.
**0.45** «Грымучы тузін». Фільм-канцэрт. 1988 год.
**1.25** Канцэрт замежнай эстрады.
**1.50** Тэлеспектакль «Залатая рыбка». 1985 год.
**5.00** «Нам рана жыць успамінамі». Фільм-канцэрт з удзелам Э. П'ехі. 1987 год.

### EUROSPORT

**10.30, 17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**12.00, 17.15** Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
**12.15, 16.15** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**13.15** Санны спорт. Кубак свету. Жанчыны.
**13.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**15.30** Санны спорт. Кубак свету.
**19.45, 22.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**21.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**0.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі.
**2.00** Конны спорт. Скачкі.
**2.15** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Фінал. Мужчыны.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Татуся».
**7.00** Камедыя «Замарожаны».
**8.25** Камедыя «Я і яго былыя».
**10.25, 14.30, 17.30, 22.00** Серыял «Пэт і Кэбедж».
**10.55** Меладрама «Невыносная жорсткасць».
**12.35, 17.10, 19.55, 22.45, 0.50, 2.50, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**12.50** Мюзікл «Джэнтльмены аддаюць перавагу бландзінкам».
**15.30** Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана!».
**18.30** Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
**20.20** Камедыя «На рыбалку!».
**22.30** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе». 1-я серыя.
**23.10** Камедыя «Усё ўключана 2».
**1.15** Камедыя «Усе выраслі».
**4.10** Камедыя «Брусель — ЗША».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.40** «Дом дагары нагамі».
**11.30** «Хронікі маскоўскага быту».
**12.20** «Гісторыі выратаванння».
**12.55, 3.00** «Тайны нашага кіно. «Аднойчы праз 20 гадоў».
**13.30, 3.25** «Аднойчы праз 20 гадоў». Маст. фільм.
**15.00, 4.40** «Ірына Алеграва. Маё жыццё — сцэна». Дак. фільм.
**16.30** «Свая праўда».
**17.30, 1.40** «Жывеш толькі двойчы». Дак. фільм.
**19.00** «Даўно не бачыліся!».
**20.30** «Калі б я цябе кахаў». Маст. фільм.
**22.30** «Страсці Дон Жуана». Маст. фільм.
**0.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** Меладрама «Салодкі лістапад».
**8.05, 17.50** Драма «Дваццаць адно».
**10.15** Драма «Валодаючы табой».
**11.55** Меладрама «Добрая дзяўчына».
**13.35, 23.45** Меладрама «Любімцы Амерыкі».
**15.25** Драма «Месца пад соснамі».
**20.00** Меладрама «Здзелка».
**21.50** Драма «Касмапаліс».
**1.40** Трылер «Адзінокая белая жанчына».
**3.50** Фантастыка «Місія «Сервіс».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Прыгоды жоўтага чамаданчыка».
**7.50** М/ф «Пра Фядота-стральца, удалога малайца».
**9.15** Камедыя «Рэальны тата».
**10.55** Камедыя «Кіндзэр-Вілейскі прывід».
**12.40** Прыгоды «Вязень замка Іф».
**16.55** Драма «Чэмпіёны».
**18.40** Трылер «Апошні ўік-энд».
**20.20** Драма «Балада пра бомбер».
**23.30** Драма «Шагал — Малевіч».
**1.50** Драма «Дзяўчына і смерць».
**4.10** Драма «Духless».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**7.00** Золата Юкана.
**8.00** Разбагацей або памры на капальні.
**9.00, 18.00** Камета стагоддзя.
**10.00** Космас: Прастора і час.
**11.00** Гульня ў лікі.
**12.00** Больш чым фокусы.
**13.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**14.00** Апакаліпсіс: узыходжанне Гітлера.
**15.00** Выратаваны львіцай.
**16.00** Адзін акіян.
**17.00** Разета: пасадка на камету.
**19.00** Зямля з космасу.
**20.00** Сутыкненне з астэроідам.
**21.00, 1.00, 4.00** Фатальная стыхія.
**22.00, 2.00, 5.00** Крывавыя гісторыі.
**23.00, 3.00** Сакрэтная атака Гітлера на Амерыку.
**0.00** Неразгаданыя тайны «Лузітаніі».

### DISCOVERY

**8.00** Як гэта ўстроена?
**8.25, 15.35** У пагоні за класікай.
**9.15** Аляска.
**10.10, 3.40** Голыя і напалоханыя.
**11.05** Дамы на дрэвах.
**12.00, 7.05** Бітвы за кантэйнеры.
**12.50, 22.00** Склады.
**13.45, 6.10** Прапажы на продаж.
**14.40** Вялікі махінатар.
**16.30** Поўны фарсаж.
**17.25, 19.15, 21.05** Навука магіі.
**23.00** Дзённікі вялікай вайны.
**0.00** Трой.
**1.00** Як уладкаваны Сусвет.
**1.55** Як пабудаваць суперкар.
**2.50** Карälі сталярнай справы.
**4.30** Майстар па стварэнні басейнаў.
**5.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.45** Як гэта зроблена?

## Zамор'е

### ТРЫВУГОЛКА НАПАЛЕОНА «ПАЦЯГНУЛА» АМАЛЬ НА ДВА МІЛЬЁНЫ



На таргах у Францыі прададзена адна з трывуголак, якія належалі Напалеону Банапарту. На аўкцыёне ў Фантэбло лот пайшоў за 1 884 000 еўра. Пакупніком стаў калекцыянер з Паўднёвай Карэі. На аўкцыёне таксама было выстаўлена каля тысячы прадметаў з напалеонаўскай калекцыі князя Манака Альбера II. Паведамляецца, што таргі выклікалі ажыятаж: у іх удзельнічалі не толькі прыватныя асобы, але і вядучыя музеі свету.

### ГЭТА НЕ БАР, ДЗЕТКА

**Жыхарка штата Мічыган, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, пераблытала турму з барам.**

Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Паў Паў. 39-гадовая амерыканка знаходзілася ў адным з бараў горада, калі неўзабаве вырашыла адправіцца ў іншую піцейную ўстанову. Жанчына села ў аўтамабіль і накіравалася ў бар, дзе, як яна паведаміла пазней, яе чакаў сябар. Аднак па дарозе яна пераблытала два будынкі і апынулася на паркоўцы перад турмой акругі Ван-Бюрэн. На яе настойлівыя спробы трапіць унутр будынка адрэагавалі супрацоўнікі праваахоўных органаў. Падышоўшы да жанчыны, яны адчулі пах спірту і правялі тэст на алкаголь. Паводле слоў шэрыфа акругі, вынік паказаў, што ўзровень алкаголю ў крыві перавышае дапушчальную норму ў два разы. Жанчына была арыштавана, ёй прад'яўлена абвінавачванні ў ваджэнні ў нецвярозым стане.

### НОЎ КАВА, ПЛІЗ ВАДА!



У бальніцах брытанскага графства Лестэршыр урачам забаранілі піць чай і каву ў працоўны час. Кіраўніцтва медыцынскіх устаноў прыняло такое рашэнне па шматлікіх просьбах пацыентаў. Людзі скардзіліся, што лекары, якія распіваюць гарачыя напоі падчас прыёму, ствараюць уражанне лянівых і нядбайных спецыялістаў.

Шмат хто з медыкаў палічылі забарону несправядлівай, новыя захады назвалі «недарэчнымі і драконаўскімі». Лекары арганізавалі кампанію супраць прыгнёту ў правах, пачаўшы са звароту ў рэгіянальныя СМІ. «Што далей — забароняць нам хадзіць у прыбіральню?» — цытуюць СМІ словы работніка адной з бальніц.

У адказ на прэтэнзіі адказная за імідж медыцынскіх устаноў Мішэль Скоўэн нагадала, што распараджэнне тычыцца толькі гарачых напояў, якія з'яўляюцца «больш інструментам для расслаблення, чым спосабам папоўніць запасы вадкасці ў арганізме». Яна падкрэсліла, што абязводжванне дактарам у любым выпадку не пагражае, бо ваду піць можна.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**

■ Каштоўнасці жыцця

# СЭРЦА НА «ДАЛОНЬЦЫ»

## Больш як 200 удзельнікаў фестывалю сацыяльнай рэкламы прагаласавалі творчасцю за абарону жыцця

**300 агеньчыкаў у памяць аб ненароджаных дзецях запалілі ў Мінску 18 лістапада. Такім чынам валанцёры нагадалі пра 30000 абортаў, якія штогод робяць у медустановах Беларусі. Незвычайная арт-акцыя прайшла на тэрыторыі сталічнага храма ў гонар іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць».**



Агеньчыкі-лампадкі ўдзельнікі расставілі ў выглядзе сілуэта 8-тыднёвага немаўля ці ва ўлонні маці — менавіта ў гэты тэрмін адбываецца большасць перарыванняў цяжарнасці... Падобная акцыя, дарэчы, вясной гэтага года ўжо адбылася ў Екацярынбургу пад назвай «Адзін з нас», а Мінск стаў першым з беларускіх гарадоў, які падхапіў эстафету напаміну пра тое, што мацярынскае ўлонне мусіць быць самым бяспечным месцам для дзіцяці, а за жыццё кожнага з яшчэ не народжаных немаўлят нясуць роўную адказнасць і маці, і бацька.

Дата правядзення акцыі была выбрана сімвалічная — менавіта 18 лістапада ў 1920 годзе ў Савецкай Расіі была прынята пастанова «Аб здароўі жанчыны», якая ўпершыню ў свеце легалізавала аборты.

— Яшчэ некалькі гадоў таму наша беларускае заканадаўства было самым ліберальным на ўсёй постсавецкай прасторы да пытання абортаў, — зазначае **юрыст Вольга КАВАЛЬКОВА.** — Неабходна было вельмі шмат працаваць, каб змяніць грамадскую свядомасць, каб давесці, што аборт — гэта не норма... За паўтара года мы з калегамі сабралі больш за 10 тысяч подпісаў беларусаў наконт больш жорсткіх мер, якія датычацца абортаў. І гэтая праца мела плён: сёлета быў прыняты закон у сферы аховы здароўя, які ўступае ў сілу 26 снежня і змяшчае некаторыя з нашых прапаноў — напрыклад, права ўрача адмовіцца ад правядзення аборту па маральна-этычных перакананнях, а таксама абавязковае кансультаванне жанчын у цэнтрах крызіснай цяжарнасці пры кожнай бальніцы, радзільні, паліклініцы. Або такі момант: толькі ў Беларусі існавала паняцце «аборт па сацыяльных паказчыках», якое дазваляла перапыніць цяжарнасць у тэрмін да 20 тыдняў — цяпер з 10 гэтых паказчыкаў засталіся ўсяго 2.

Летась напярэдадні сумнай даты 18 лістапада ў Беларусі пад дэвізам «Так! Будзе жыццё!» адбыўся першы фестываль сацыяльнай рэкламы ў абарону жыцця і сям'і «Далонька». Сёлета ж вынікі падводзіць другі па ліку фэст, які набыў ужо статус міжнароднага. Сцэнарыі, фотаздымкі, малюнкі, сацыяльныя і мультыплікацыйныя фільмы, відэаролікі, знятыя не толькі на камеру, але нават на мабільны тэлефон — удзельнікі прадставілі творчыя работы ў самых розных жанрах і тэматычных кірунках, аб'яднаных адзінай мэтай адраджэння і ўмацавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, абароны дзяцінства і мацярынства, любові і вернасці.

— Калі ў першым фестывалі ўдзельнічала ўсяго 16 відэаролікаў, то сёлета мы атрымалі ўжо больш як 200 работ, прычым як ад аматараў, так і прафесіяналаў — з Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі і Грузіі, — адзначыла член журы фестывалю, папулярная **тэлевядучая Святлана ПАНКРАТАВА**. — Хвалявацца ўдзельнікам засталося зусім нядоўга — 22 лістапада адбудзецца цырымонія ўзнагароджання пераможцаў фестывалю сацыяльнай рэкламы «Далонька».

Справа абароны жыцця ад самага пачатку павінна быць не эпізадычнай, а сістэмнай і пастаяннай, адзначыў яшчэ адзін член журы фестывалю, **кіраўнік Цэнтра абароны мацярынства і сямейных каштоўнасцяў Беларускай праваслаўнай царквы іерэй Дзмітрый ГРЫЦЭНКА.** «У многіх населеных пунктах Беларусі, у тым ліку ў Мінску, Магілёве, Баранавічах, нашы валанцёры наладзілі пастаяннае перадабортнае кансультаванне, у жаночых кансультацыях размешчаны разнастайныя даведачныя матэрыялы і агітплакаты, праводзяцца семінары з удзелам прадстаўнікоў сістэмы адукацыі і аховы здароўя. Аднак, як паказвае вопыт, найбольш дзейсная праца ў гэтым кірунку — сустрэчы і гутаркі з моладдзю, са студэнтамі і старшакласнікамі. Узброеныя ведамі, маладыя людзі ўваходзяць у дарослае жыццё ўжо асэнсавана і з цвёрдым перакананнем у каштоўнасці жыцця».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**





■ Неасабісты суб'ектыў

# Рогат Джаконды

## Аб рэкламным «твары» плагіяту

У лістападаўскай халоднай цемры цёплыя фарбы гэтага вялікага рэкламнага плаката кінуліся ў вочы адразу. Размясціўся ён на бойкім месцы — у пераходзе да метро «Акадэмія навук», дзе яшчэ ўчора вісела рэклама ці то рамонту мабільнікаў, ці то магазіна моднага адзення. Цяпер жа на тых, хто спускаецца ў пераход, глядзіць з выявы салдат-пераможац, якім мы прывыклі яго бачыць яшчэ з часоў школьнага маленства, які для некалькіх пакаленняў — неад'емны сімвал Перамогі ў апошняй вайне. На ім форма і каска 1945-га, усё намалявана прыглушанымі, але надзвычай выразнымі колерамі. І надпіс вялікімі літарамі: «Пераможам!». Якраз плакат таго часу — так і падумалася здалёк, тым больш што праз паўгода — 70-годдзе той самай Перамогі. Рыхтуемся, значыць, нагадваем людзям... Падышоўшы бліжэй, згледзела: не, зусім не пра тое плакат. У намаляванага ў стылі 40-50-х салдата замест яго твару ўстаўлена сучаснае фота канкрэтнага чалавека. Сяржук Б. захварэў на рак у 29 гадоў. Перамагчы хваробу дапамагла каханая дзяўчына, якая была побач. Цяпер яны жанатыя і гадуюць дачушку. Страшная немач адступіла перад сілай іх пачуцця. Гэта кранальная гісторыя напісана на плакаце побач з выявай. Гэтак як заклік да ўсіх, хто змог перамагчы свой несуцяшальны дыягназ, напісаць сваю гісторыю пераадолення...

Несумненна, ідэя цікавая і вартая павагі і ўвагі. І мэта яе зразумелая — паказаць чалавеку, які змагаецца з ракам, што ён не адзінокі, што дыягназ — гэта не смяротны прысуд, што хваробу можна перамагчы. Мяркуючы па запрашэнні дасылаць свае гісторыі, падобны плакат не апошні. Будуць новыя сюжэты і новыя канкрэтныя героі. Напэўна, з той жа серыі. Не здзіўлюся, калі жанчына, якая вылечылася ад страшнай хваробы, з'явіцца заўтра на білбордзе ў вобразе Радзімы-маці, якая будзе заклікаць не баяцца, а ісці наперад і перамагаць... Словы «перамога», «пераможам» большасцю атаясамлівае менавіта з Вялікай Айчыннай вайной, дык чаму б не выкарыстаць гэтую тэму на карысць актуальнай сацыяльнай рэкламы?..

Вось тут, лічу, самае месца паразважаць не пра ідэю — пра яе ўвасабленне. Не толькі ў гэтым канкрэтным выпадку — пра тэндэнцыю наогул. Не ведаю, як вам, але мне, напрыклад, ніякавата і нават сорамна, калі бачу падобнае. І за тых «крэатыўшчыкаў», што прапануюць такі прадукт, і за сябе, і за ўсіх, хто воленс-ноленс вымушаны яго спажываць. Мы ўжо проста прывыклі да таго, што ў рэкламе героі вядомых любімых фільмаў падробленымі галасамі нясуць поўную лухту пра будматэрыялы і рамонт, кустодзіеўская купчыха п'е не чай са сподачка, а сок ці што мацнейшае са шклянкі, Джаконда ўсміхаецца не загадкава, а рагоча на ўсе трыццаць два, рэкламуючы зубную пасту ці новы стаматалагічны кабінет...

І каб сказаў, што робяць гэтую тапорную справу дылетанты — дык жа не скажаш! Курсы піяршчыкаў, рэкламшчыкаў працуюць без збояў, ва ўніверсітэтах дзейнічаюць калі не факультэты, дык аддзяленні, якія рыхтуюць спецыялістаў гэтага профілю, а пра ўдзел беларусаў у «Канскіх львах» — самым аўтарытэтным міжнародным фестывалі рэкламы, дзе што ні ролік — то твор мастацтва, нешта дагэтуль не чуваць.

Затое поўна плагіятараў, якія лічаць, што можна ў вядомы твор, на які іншыя людзі аддавалі душу, натхненне, частку жыцця, які мільёны захапляў, прымушаў задумацца, вёў у бой, уставіць сваю «фішку», нярэдка на мяжы пошласці (менавіта ў гэтым і ёсць уласна «фішка») — і гэта ўжо будзе выдатны рэкламны прадукт. За які яны, «крэатыўшчыкі», атрымаюць немалыя грошы. Пра тых, хто на гэта пасля глядзіць, хто гэта слухае, наўрад ці думаюць. «Піпл схавае». А да Вінчы, Вердзі або Кустодзіеў з магілы не ўстануць і аўтарскія правы абараняць не стануць.

І святога, недатыкальнага ў гэтым плане няма нічога, хіба рэлігія. Але дзе гарантыя, што заўтра якому-небудзь самапальнаму «піяршчыку» не стукне ў галаву прыляпіць твар мадэлькі на якую славутую ікону? І што яму за гэта будзе, акрамя людскога абурэння, на якое ён пляваць хацеў?

Дарэчы, пра святое. Слова «перамога», прынамсі ў нашым грамадстве, мае два абсалютна адрозныя значэнні — не ў слоўніках, дык у свядомасці. Ёсць перамога над слабасцю, над абставінамі, над шкоднымі звычкамі, над хваробай — і ў любым сэнсавым нюансе яна вартая павагі, аб ёй варта расказваць людзям і ставіць у прыклад. А ёсць Перамога — менавіта так, з нязменнай вялікай літары. Тая, якая ў маі, якая са слязьмі на вачах, якую сёння спрабуюць у нас аспрэчыць, якая правярае нас на грамадзянскую сталасць. І падмяняць гэтыя паняцці, нават з самых высакародных меркаванняў, не варта. Павінна ж быць нейкая маральная рыса, пераскочыць якую не дазволяць памяць і сумленне.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**


## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 02 декабря 2014 года повторных торгов с условиями по продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта, находящегося в собственности ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование и местонахождение продаваемого объекта) | **Не завершенный строительством незаконсервированный объект «Застройка микрорайона «Сухарево-5» (третья очередь строительства). Жилой дом № 37 по генплану со встроенными помещениями. Третий пусковой комплекс-сбербанк», расположенный по адресу: г. Минск, ул. Пимена Панченко, 60** |
| Продавец | ОАО «АСБ Беларусбанк», пр-т Дзержинского, 18, 220089, г. Минск |
| Организатор торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| Начальная цена предмета торгов (без учета НДС) | 4 413 300 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 400 000 000 белорусских рублей |
| Условие торгов | Победитель торгов (единственный участник торгов) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Покупатель обязуется не размещать в приобретаемом помещении объекты и производства, перечисленные в п.9 ст.21 Главы 4 Жилищного кодекса Республики Беларусь. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта, находящегося в собственности ОАО «АСБ Беларусбанк», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае признания торгов несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику торгов), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного объекта с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником торгов) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником торгов) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 20 дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **02 декабря 2014 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 21.11.2014 по 01.12.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»), (017)309-06-60 (ОАО «АСБ Беларусбанк»).**



03 декабря 2014 года в 12.00. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Татьяна».

Повестка дня:
1) Об исправлении в тексте устава общества.
2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Татьяна»: г. Гомель, ул. Павлова, 26.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Павлова, 26.
Время регистрации в день проведения собрания: с 11.30 до 12.00.
